незалежная газета

№ 45 (595) 4 снежня 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацвяргі

**Зелянкоўская ў ролі Максіма Багдановіча**

Старонка 9



**Новы перадзел Расіі**

Старонка 5



**Беларуса-палітуцекача забілі і разрэзалі**

Старонка 8


**У НУМАРЫ**

**Ганіце баксы**

Цана бензіну ў рублях знізілася на 10%, а ў далярах — аж на 22 %. **Старонка 8.**

**Казулін гатовы з’ехаць**

Палітык не можа знайсці працы ў краіне, таму разглядае варыянты працаўладкавання за мяжой. **Старонка 4.**

**Севярынец па сем гадзін у суткі працуе над новым раманам**

Адначасова старшыня аргкамітэту Беларускай хрысціянскай дэмакратыі актыўна займаецца падрыхтоўкай да ўстаноўчага з’езду партыі. **Старонка 4.**

**Удвая больш «Народнага альбому»**

Канцэрт культавага музычнага праекту. **Старонка 11.**

**Аднагодак БНР**

Сын праведніка свету, «вораг народу», у вайну дырэктар гімназіі ў Мар’інай Горцы, зэк у Інце. Лёс чалавека і гісторыя краіны — пра Уладзіміра Лялькова піша Сямён Печанко. **Старонка 13.**

**Нацыяналісты — гэта хто?**

Піша Сяргей Дубавец. **Старонка 5.**


# Еўропа хоча перакупіць Лукашэнку

Калі да вясны 2009 году Беларусь вытрымае нефармальныя ўмовы, беларускага кіраўніка запросяць на саміт «Усходняга партнёрства» ў Прагу. Еўрастабільнасць для Беларусі — артыкул Алеся Кудрыцкага. **Старонка 2.**



PHOTOBYMEDIA.NET

## Саюзу труба

Пуцін падпісаў праект пабудовы БТС–2 у абыход Беларусі. Здарылася гэта пасля дыпламатычнага скандалу паміж Мінскам і Масквой.

Запланаванае на 1 снежня паседжанне т.зв. найвышэйшай дзяржрады саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі сарвана. Інфармацыю пра перанос паседжання пацвердзілі Адміністрацыя прэзідэнта Расіі, расійскае МЗС і апарат дзяржсакратара саюзнай дзяржавы Барадзіна. Як піша «КоммерсантЪ», «бакі не сышліся ў поглядах на развіццё саюзнай дзяржавы» і перанеслі сустрэчу на няпэўны тэрмін. Паводле іншай інфармацыі, беларускі бок у апошні момант прапанаваў уключыць у парадак дня пытанне цаны на энерганосьбіты. Што важна, адкладзена прызначанае падпісанне пагаднення пра афіцыйнае стварэнне аб’яднанай сістэмы супрацьпаветранай абароны. Ні адзін з бакоў не бярэ на сябе адказнасці за зрыў перамоваў. Масква вінаваціць Мінск, а Мінск — Маскву.

Адклад паседжання — значны дыпламатычны скандал, які можа папсаваць і без таго дзіўныя адносіны Беларусі ды Расіі. Адказ з Масквы не прымусіў сябе чакаць.

Увечары таго ж дня Уладзімір Пуцін падпісаў загад №1754-р, які вызначае парадак праектавання і будаўніцтва ў два этапы Балтыйскай трубаправоднай сістэмы (БТС-2) па маршруце Унеча—Усць-Луга. Трубапровод пойдзе ў абыход Беларусі.

Мінск, у сваю чаргу, падняў тарыфы на транзіт нафтапрадуктаў. Рашэнне мае ўступіць у сілу з 1 студзеня.

**Працяг на старонцы 2.**

## Крызіс, крызіс, крызіс

Дзяржстат абнародаваў эканамічную статыстыку за кастрычнік. Яна фатальная: проці верасня адток укладаў склаў 6%, рознічны тавараразварот знізіўся на 3,8%, аб’ём прамысловай прадукцыі скараціўся на 2,9%. Валютная выручка зменшылася проці жніўня на 25%.

Бывай, спажывецкі бум. Першы раз за доўгія гады за кастрычнік аб’ём рознічнага тавараразвароту не вырас. Нават знізіўся — на 3,8%. Гэта значыць, насельніцтва адчула эканамічныя цяжкасці і завязала кашалі.

**Працяг на старонцы 3.**

КАМЕНТАР РЭДАКЦЫІ

Шаноўныя чытачы, ад гэтага нумару «Наша Ніва» будзе выходзіць школьным правапісам.

«НН» пераходзіць на яго, бо ставіць перад сабой задачу заваёвы новай аўдыторыі. Вяртанне ў кіёскі «Саюздруку» дае такі шанец. Непрызвычаеным людзям чытаць па-беларуску класічным правапісам цяжэй, моцна цяжэй. Тое адназначна паказвалі сацыялагічныя даследаванні, дый кожны з нас тое бачыў або адчуваў на сабе. Гэты псіхалагічны бар’ер абмяжоўваў аўдыторыю. Мы хочам, каб новыя і новыя людзі пачалі набываць газету, ідэнтыфікавалі беларускую мову як сваю, не адчувалі ад яе адчужэння. Было б недаравальна, каб непрыяцелі беларускага тыкалі: вось, мы іх дазволілі, і што — жменька чытачоў у іх.

Гэты крок ані кан’юнктурны, ані прадыктаваны эмоцыямі. Рэдакцыя даўно адчувала такую патрэбу для пашырэння кола актыўных носьбітаў беларускай культуры. Лічым патрэбным зрабіць гэты крок цяпер. Спадзяемся, што яго пазітыўны палітычны і культурны эфект можна будзе ацаніць ужо праз некалькі гадоў.

Незалежнае грамадства не павінна замыкацца ў сваім коле. Нацыянальная свядомасць глыбока пранікла ў шырокія слаі, а незалежнасць краіны стала нацыянальным кансенсусам, на парадку дня — выхад Беларусі са стану васальнае залежнасці ад Расіі, кансалідацыя паўнапраўнае еўрапейскае нацыі.

«НН» пачатку ХХ стагоддзя выходзіла рознымі правапісамі, мяняла іх, але не змяняла пазіцыі і задач. Так і цяпер. Мяняецца правапіс, але нязменны дух газеты. «НН» застанецца такой сама чыста беларускай, як і была. Наша святыня — мова. Правапісаў два, яна адна.



Жан-Эрык Хольцапфель, кіраўнік офісу Еўракамісіі ў Беларусі.

# Еўрастабільнасць для Беларусі

## Ці наважыцца ўрад на еўрарамонт у агульнанацыянальных маштабах?

Стабільнасць, чарка ды скварка, разумны кіраўнік — гэта тыя кіты, на якіх які ўжо год трымаецца ідэалогія рэжыму. Здавалася б, тут ніхто не можа канкураваць з Аляксандрам Лукашэнкам. І вось — сенсацыя: Еўрасаюз прапануе беларусам практычна тое самае, што і «апошні дыктатар Еўропы». «Стабільнасць, дабрабыт ды эфектыўнае кіраванне», — вось што мае атрымаць Беларусь, далучыўшыся да палітыкі Усходняга партнёрства, новай ініцыятывы Еўрасаюзу.

3 снежня ў Брусэлі адбылася сумесная прэс-канферэнцыя Старшыні Еўракамісіі Жазэ Мануэля Барозу ды Камісара Еўрасаюзу ў пытаннях вонкавых дачыненняў і еўрапейскай палітыкі суседства Беніты Ферэра-Вальднэр. Фактычна, гэта была ўрачыстая прапанова рукі ды сэрца шасці еўрапейскім краінам, якія дагэтуль знаходзяцца ў падвешаным стане паміж аб’яднанай Еўропай ды аўтарытарнай Расіяй. Праўда, кіраўніцтва ЕС пакуль гатовае толькі да «грамадзянскага шлюбу», а вось «штампу ў пашпарце» не гарантуе. Жазэ Мануэль Барозу адназначна заявіў на прэс-канферэнцыі: па-

Працяг на старонцы 7.

# Саюзу труба

Працяг са старонкі 1.

Шэраг падзей, якія адбыліся пазней, могуць сведчыць пра тое, што Мінск і Масква паспрабавалі залагодзіць канфлікт. 1 снежня Расельгаснагляд працягнуў дазвол на экспарт у Расійскую Федэрацыю жывёлагадоўчай прадукцыі дваццаці беларускіх прадпрыемстваў да 20 снежня. На наступны дзень на сустрэчы са старшынём расійскага Ашчаднага банку Германам Грэфам Аляксандр Лукашэнка заявіў, што не бачыць ніякіх перашкод для работы банку ў Беларусі.

**Сямён Печанко**

НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

Я ЛЮБІЎ ЦІБЯ, РАСІЯ...

Я любіў ціб, Расія:
Залатыя купалы,
Нефцегазавую сілу,
Льготы, крЭдзіт, даларЫ...

А ціпер сіжу асіплы,
Лысы, грусны і адзін.
Этат Вова очань хітры —
Не памог і Барадзін.

І яго втарая сушчнасьць —
Мелкі гадзкі Медзвядзёў —
Тожа нас ні хоча слушаць.
Ах, прашчай, мая любоў...

Павярну на запад вектар,
Смажу лыжы — і апяць...
Хто тут глаўны, гдзе дзірэктар?
Дайце вас пацалаваць!

**© Ўнутрэнні ўраг**

ПАРАЛЕЛІ

### У Бабруйску правялі фестываль «Мы — бульбашы!»

У горадзе ад 2001 г. праводзяцца фестывалі бульбы. Ініцыюе іх Упраўленне адукацыі гарвыканкаму. Чарговы меў назву «Мы — бульбашы!» Каманды 15 школаў рыхтавалі літаратурна-мастацкія кампазіцыі на зададзеную тэму, музычныя і танцавальныя нумары, паказвалі вырабы з бульбы.

**Паводле postimees.ee, tut.by**

### Прэзідэнт Юшчанка: «Мы не хахлы»

Віктар Юшчанка перакананы, што ў найбліжэйшыя гады між Украінай і Расіяй наладзяцца добрыя стасункі: «Мы павінны ажыццявіць гістарычнае прымірэнне. Спытайце сёння паляка: хто твой сябра? Ён скажа: украінец. Я перакананы, нас чакае аналагічнае з расійскім народам». Ён адзначыў роўнасць дзвюх краінаў: «Мы павінны адысці ад «малодшага брата». Мы не маларосы, мы не хахлы. Ёсць вялікая любоў да Расіі. Але мы незалежная дзяржава».

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Прэзентацыя «Слуцкага Збройнага Чыну»

5 снежня а 19-й на Сядзібе БНФ (Машэрава, 8) адбудзецца прэзентацыя дакументальнага фільму «Слуцкі Збройны Чын» пра падзеі антысавецкага паўстання 1920 г. на Случчыне. Уваход вольны.


# Рэкамендуем падпіску праз Рэдакцыю: найтанней, найхутчэй

Мы рэкамендуем і просім чытачоў падпісвацца праз Рэдакцыю. Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

1) Яна нам выгаднейшая фінансава.

2) Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

3) Лічым важным захаваць сістэму самараспаўсюду дзейнай. Лішне тлумачыць, чаму.

Цана падпіскі праз Рэдакцыю **10 000 руб. на месяц**.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей **63125**, для прадпрыемстваў **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |
|---|---|---|---|

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |
|---|---|---|---|

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 10 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**


### Дзякуй

**Мікалаю К.** з Лунінецкага раёну.
**Ірыне З.** з Смалявіцкага раёну.
**М.Ш.** з Клімавіцкага раёну.
**Галіне Ч.** з Рэчыцкага раёну.
**Мікалаю Ш.** з Салігорскага раёну.
**С.Т.** зь Лідзкага раёну.
**Ю.К., Віктару А., Багдану Дз.** з Гомелю.
**Уладзімеру А.** з Ушацкага раёну.
**Аляксандру Д.** з Карэліцкага раёну.
**Н.Б.** з Астравецкага раёну.
**А.Г.** з Кіраўскага раёну.
**М.Т.** з Слуцкага раёну.
**Л.П., Міхаілу Л., Віктару С., А.К., Юр’ю Л., М.Л., Уладзімеру Г., Аляксандру С., К., Валянціне Ш., Вікторыі М., У.Г., Тацяне Ф., Уладзімеру Б., А.Ш., Ірыне К., Аляксею Ш., М.Б., В.К., Вользе А., Л.Г., Кацярыне Дз., П.Ж., Анатолю С., Сяргею У., Г.К., Ізмаілу А., Алесю Дз., Мікалаю Б., Натальлі М., Г.Л., М.Я., В.Ц., К.М., Д.Ш., С.Ш., Эльяшу Б., В.Н., П.Д., Н.Б., Веры С., Вользе Ч., А.З., А.П.** зь Менску.

# Крызіс, крызіс, крызіс

Працяг са старонкі 1.

Кастрычнік стаў таксама першым месяцам падзення аб'ёму прамысловай прадукцыі. Сярод рэгіёнаў больш за ўсіх зменшыла абароты Гродзенская вобласць — мінус 10%. Віцебская скараціла вытворчасць на 7,3%, Мінская — на 5,9%, а Гомельская вобласць — на 2%.

Кастрычнік стаў чорным месяцам для чорнай металургіі Беларусі. Зніжэнне вытворчасці ў гэтай галіне, найбольш адчувальнай да сусветнага фінансавага крызісу, склала 23,7%. Адбыўся абвал вытворчасці электрапыласосаў — на 51,7%, электраплітаў — на 46,9%, макаронных вырабаў — на 23,1%, матацыклаў — на 19,5%, мінеральных угнаенняў — на 12,3%, тэлевізараў — на 8,7%, трактароў — на 7,1%. Прыкметна прытармазіла цэментавая прамысловасць — на 2,5%.

Гэтыя галіны шмат у чым завязаныя на замежныя рынкі, дзе назіраецца падзенне попыту.

Непрыемнасць чакае і золатавалютныя запасы: валютная выручка зніжаецца трэці месяц запар.

Са жніўня па кастрычнік ад прададзенай за мяжу прадукцыі паступіла валюты менш амаль на 25%. У верасні падзенне склала 12,9% у дачыненні да жніўня, у кастрычніку — на 16,1% у адносінах да верасня. Гэта самы нізкі паказчык ад студзеня 2008 году.

Тым часам за 10 месяцаў запасы гатовай прадукцыі выраслі на 43,2%.

Рост таварных запасаў пацвярджае пагаршэнне сітуацыі ў замежным і ўнутраным гандлі.

Акрамя таго, аналітыкі агенцтва ПРАЙМ-ТАСС зважаюць на тое, што ўвод у эксплуатацыю жытла ўпаў у кастрычніку ў параўнанні з папярэднім месяцам больш як у пяць разоў — да 168,8 тыс. кв. м.

Беларусь з лагам у месяц—два паўтарае ўсе негатыўныя тэндэнцыі, што маюць месца ў Расіі ды іншых краінах, якія крызіс закрануў найбольш. Гэта азначае, што пік крызісу ў Беларусі можа прыпасці на вясну або лета наступнага году.

**Мікола Бугай**

ІНШАЯ ДУМКА

## Зарана баяцца

крызісу, мяркуе эканаміст Даследчага цэнтру Інстытуту прыватызацыі і мэнэджмэнту Аляксандр Чубрык.

**«Наша Ніва»: На колькі могуць ўпасці заробкі ў Беларусі на піку крызісу?**

**Аляксандр Чубрык:** Многае будзе залежыць ад канкрэтных дзеянняў ураду. Урад ужо пачынае рэагаваць на прапановы МВФ — не будзе павялічаная тарыфная стаўка першага разраду. На мой погляд, максімальнае зніжэнне можа быць у раёне 5%.

**«НН»: Шкоду якім сферам гаспадаркі найбольш нанясе фінансавы крызіс?**

**АЧ:** Усім дастанецца. Прамысловасці праз экспарт, сельскай гаспадарцы – праз субсідыі, паслугам – праз змяншэнне унутранага попыту. Увогуле ж пра магчымую глыбіню крызісу ў Беларусі гаварыць заўчасна. Гэта будзе залежыць ад таго, ці ўдасца ў свеце ў цэлым знайсці нейкія механізмы яго пераадолення.

**Запісаў ЗП**

# Улады абразаюць заробак бюджэтнікаў

Не афішуючы таго, урад знізіў тарыфную стаўку 1 разраду з 91 тыс. рублёў да 77 тыс. рублёў (на 15,4%) з 1 снежня.

Стаўка ўжываецца для аплаты працы ў арганізацыях, фінансаваных з бюджэту.

Пра гэта паведаміла інфармацыйная кампанія «Інтэрфакс-Захад», спасылаючыся на пастанову ўраду №1818 ад 29 лістапада 2008 г., тэкстам якога валодае агенцтва.

Ні на сайце ўраду, ні на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, ні на сайце pravo.by такой пастановы не змешчана, хоць ёсць пастановы з далейшай нумарацыяй.

Такім чынам, пастанова ўраду адмяняе пастанову Савету міністраў, згодна з якой тарыфная стаўка з 1 лістапада вырасла з 73 тыс. да 91 тыс. (на 24,7%).

Прычым увосень меркавалася напачатку павысіць тарыфную стаўку з 1 кастрычніка, але павысілі толькі з 1 лістапада.

Да гэтага ж тарыфная стаўка павышалася ў красавіку 2008 г. з 70 тыс. да 73 тыс. рублёў.

З улікам 14-працэнтнай інфляцыі гэта азначае, што за 2008 г. адбылося зніжэнне рэальнага заробку.

**АГ**



## Мільярд даляраў на ўратаванне «Белаграпрамбанку»

Гонар прыняць рашэнне аб павелічэнні ўласнага капіталу «Белаграпрамбанку» на $1 млрд дастаўся А.Лукашэнку.

Загадам кіраўніка дзяржавы вырасце ўласны капітал банку, які спецыялізаваўся на працы з аграрным сектарам. Гэта дазволіць утрымаць на нагах праблемны банк і самы праблемны сектар гаспадаркі.

Рашэнне аб павелічэнні ўласнага капіталу «Белаграпрамбанку» звязанае з крызісам ліквіднасці. Аграпрамысловыя прадпрыемствы сутыкнуліся з падзеннем попыту і дэфіцытам крэдытных рэсурсаў.

Між тым згортванне дзейнасці буйнога банку магло б выклікаць праблемы ў іншых банкаў паводле прынцыпу даміно.

Мільярд даляраў дапамогі банку — рэкордная для Беларусі лічба.

Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Андрэй Кабякоў у сваім выступе перад дэпутатамі ў мінулую пятніцу назваў своечасовай падтрымку банкаўскай сістэме краіны. Яна мае быць вылучаная ў аб'ёме $1,5 млрд за кошт сродкаў бюджэту. Грошы маюць паступіць у снежні.

А.Кабякоў патлумачыў рашэнне аб павелічэнні статутных фондаў дзяржбанкаў неабходнасцю ўмацавання банкаўскай сістэмы Беларусі.

Як бачым, львіная доля першага пакету дапамогі дасталася «Белаграпрамбанку».

## Грэф у Менску. А нашто?

З старшынём праўлення «Сбербанку» Расіі Германам Грэфам сустрэўся сам Лукашэнка. У мінулым адзін з кіраўнікоў ураду, цяпер зямляк Пуціна і Мядзведзева Грэф узначальвае найбольшы Расіі.

Лукашэнка падчас сустрэчы заявіў, што не бачыць ніякіх перашкодаў для працы «Сбербанку» ў Беларусі.

У сваю чаргу Грэф зазначыў, што «Сбербанк» Расеі мае намер прыйсці ў нашу краіну ў якасці стратэгічнага партнёра.

«Сбербанк» вызначае пашырэньне ва Ўсходняй Эўропе як адну з сваіх стратэгічных мэтаў. Прычым прайшла інфармацыя, што «Сбербанк» хоча купіць большасць акцый у групе «Райфайзэн», якой належыць таксама беларускі «Прыёрбанк».

**МБ**

СЦІСЛА

### «Белінвестбанк» прыпыніў выдачу ўсіх крэдытаў

Пакуль што — да сярэдзіны снежня, пакуль не надыдзе дапамога ад уладаў.

### Стаўкі ўгару

У той жа час «Белзнешэканамбанк» павысіў стаўкі па крэдытах: жыллё з 17% да 22% (у рублях), на аўтамабілі ў рублях — з 19% да 24%. Спажывецкі вырас да 24%, зазначае infobank.by. Адначасова банк падняў стаўку па ўкладах «Універсальны» і «Выгадны» на 0,75—1,5%.

### Курс даляра дасягнуў 2170—2212 рублёў

Па выніках таргоў замежнымі валютамі 3 снежня на Беларускай валютна-фондавай біржы (БВФБ) курс даляра вырас на 2 рублі і склаў 2170 рублёў. Тым часам банкам дазволена накручваць да яго яшчэ 2%, і яны карыстаюцца з таго напоўніцу. У абменніках даляры прадаюць за 2212 рублёў.

### Спыніў працу маслазавод у Добрушы

130 працаўнікоў заводу адпраўленыя ў вымушаны адпачынак. Работнікам аплацяць дзве траціны тарыфнага акладу.

Завод выпускаў масла, тварог, малако, казеін. Цяпер гаспадаркі вязуць малако на перапрацоўку ў Гомель.

# Віцэ-прэм'ер Кабякоў: Крызіс Беларусі пагражае мінімальна

З выступу намесніка старшыні ўраду Андрэя Кабякова перад дэпутатамі.

Чаму мінімальна? Бо Беларусь «не абцяжарыла сябе высокай замежнай пазыкай» і не пусціла ў эканоміку спекуляцыйны капітал. Разам з тым, дадаў віцэ-прэм'ер, «Беларусі не ўдасца поўнасцю адысці ад уплыву сусветнага фінансавага крызісу».

«Калі чытаеш аб тым, што ва Украіне прыпынілі сваю работу 17 з 35 доменных печаў у галоўнай галіне краіны — металургіі, як «пасыпаліся» вытворчасці на сусветных аўтагігантах, востра разумееш, што пазбегнуць уплыву крызісу не ўдасца нікому, у тым ліку і Беларусі», — сказаў Андрэй Кабякоў.

Забарона авансавых плацяжоў па імпарце ў Беларусі захаваецца, заявіў віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў.

Інфляцыя па выніках году складзе 14—14,5 %, прагназуе віцэ-прэм'ер. Гэта трохі менш, чым ва Украіне, але трохі болей, чым у Расіі.

«Нядаўна мы атрымалі першую частку расійскага крэдыту на суму $1 млрд, і ёсць перспектыва, што ў лютым атрымаем яшчэ $1 млрд», — сказаў Андрэй Кабякоў. Пры гэтым ён не выключыў верагоднасці таго, што

Працяг на старонцы 4.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Казулін гатовы з’ехаць

**Палітык не можа знайсці працы ў краіне, таму разглядае варыянты працаўладкавання за мяжой.**

Паводле прызнання палітыка, працаваць ён бы хацеў па спецыяльнасці — выкладчыкам. Дзе менавіта, пакуль няма ведама. Сам Казулін на гэта кажа: «Жыць трэба ў любым выпадку».

«НН» прасіла сп.Казуліна пра інтэрв’ю, але на гэтым этапе прафесар абмежаваў кантакты з прэсай. «Я ўжо быў выказаўся пра магчымасць ад’езду, пасля чаго пачаліся шматлікія чуткі, недагаворкі. Пакуль прыняў рашэнне ніяк не выказвацца на гэты конт. Кропкі над «і» ў гэтай справе расстаўляць яшчэ рана, у мяне цяпер іншыя прыярытэтныя пытанні», — зазначыў А.Казулін.

Паводле нашай інфармацыі, у атачэнні Казуліна не засталося амаль нікога з яго былой каманды. Адышлі нават тыя, хто заставаўся верным былому кандыдату ў прэзідэнты і пасля яго зняволення з пасады старшыні БСДП.

Адразу па парламенцкіх выбарах Казулін знік з палітычнага жыцця — не было выказванняў у прэсе, перастаў хадзіць на пасяджэнні Палітрады АДС. Не з’явіўся Казулін і на Дзядах. Прыкладна ў гэты самы час ён адпачываў «на самым блізкім акіяне».

**Зміцер Панкавец**

# Севярынец па сем гадзін у суткі працуе над новым раманам

**Адначасова сустаршыня аргкамітэту Беларускай хрысціянскай дэмакратыі актыўна займаецца падрыхтоўкай да ўстаноўчага з’езду партыі.**

«На сёння ў базе БХД знаходзіцца 1800 чалавек, — кажа Павал Севярынец. — Для рэгістрацыі Мін’юсту патрэбна мінімум тысяча. Вось цяпер рыхтуем падобны спіс «тысячы смелых». Па папярэдніх разліках, з’езд пройдзе 1 сакавіка. Мне здаецца, калі добра папрацаваць, што шанцы на рэгістрацыю прыкладна 50 на 50. Апошнія падзеі з той жа незалежнай прэсай паказваюць, што рэжым гатовы ісці на некаторыя саступкі. Дарэчы, за апошняе дзесяцігоддзе гэта толькі другая спроба зарэгістраваць апазіцыйную партыю. Першую — няўдалую — рабіў Навасяд», — кажа П.Севярынец.

Палітыкай жыццё былога палітвязня не вычэрпваецца. Палітык расказвае, што акурат на днях адбыўся восьмы выпуск дыджэяў Адраджэння — свайго роду лектараў на тэму нацыянальнае культуры. Вось-вось мае выйсці ілюстраваная кніга Паўла «Люблю Беларусь».

Працэ Севярынец і над новым творам.

«Пішу раман. Працую над ім па сем гадзін у суткі. Гэта будзе раман пра Беларусь, болей пакуль сказаць не магу. Калі скончу? Думаю, што гэта справа не бліжэйшага году».

**Зміцер Панкавец**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Віцэ-прэм’ер Кабякоў: Крызіс Беларусі пагражае мінімальна

Працяг са старонкі 3.

гэтыя рэсурсы могуць быць атрыманыя ў эквіваленце расійскіх рублёў.

Паводле словаў Андрэя Кабякова, беларускі бок гатовы перайсці ў разліках з Расіяй з даляраў на расійскія рублі. На гэтым настойвае Крэмль. «Але для таго, каб гэтыя разлікі ажыццяўляліся, патрэбныя пэўныя аб’ёмы расійскіх рублёў», — сказаў віцэ-прэм’ер.

Таксама Андрэй Кабякоў высока ацэньвае шанцы на атрыманне крэдыту Міжнароднага валютнага фонду.

**Мікола Бугай**

## І не хочацца, і колецца

**Лукашэнка не спяшаецца з прызнаннем Абхазіі і Асеціі.**

«Мы хацелі б прайсці гэты шлях, як прайшлі яго расіяне, — вельмі абцякальна заявіў 24 лістапада Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв’ю агенцтву Франс Прэс. — Прэзідэнт павінен падпісаць указ, калі гэта прызнанне. Але я хацеў бы, каб гэтая тэма прагучала ў грамадстве, каб наш новы парламент гэта абмеркаваў».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што «калі хтосьці ставіць гэтае пытанне, што гэта — падтрымка Расіі — дарэмна». «Не думаю, што гэта вельмі важнае сёння пытанне для іх. Ужо яны існуюць дэфакта і дэ-юрэ як незалежныя дзяржавы».

**ЗП**




## СЦІСЛА

### Нягледзячы на некаторыя паляпшэнні...

...выбары ў Беларусі не адпавядалі міжнародным стандартам, гаворыцца ў выніковым дакладзе Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ па ацэнцы мінулых парламенцкіх выбараў.

### Сарвана вечарына, прысвечаная Слуцкаму збройнаму чыну

Супрацоўнікі КДБ запатрабавалі ад гаспадара мінскага клуба DAclub, дзе меркавалася адзначыць гадавіну Слуцкага збройнага чыну, скасаваць дамову аб арэндзе залы. На вечарыну было запрошана каля сотні гасцей з розных рэгіёнаў Беларусі. Планавалася, што ў DAclub выступіць бард Аляксандр Мельнікаў, гурт «Паўночны воўк» з Віцебска, а таксама маладыя музыкі са Слуцка і Мінска.

### Спынілі крымінальныя справы...

...супраць Юрася Карэтнікава і Міхаіла Шарамета за выбух 4 ліпеня. Яны былі затрыманыя 16 ліпеня і змешчаныя ў следчы ізалятар КДБ па падазрэнні ў датычнасці да выбуху. Праз трое сутак хлопцаў адпусцілі. Самае цікавае, што 4 ліпеня Карэтнікаў быў у Страсбургу, пра што сведчыць штамп у ягоным пашпарце.

### У Лябедзькі канфіскавалі паўтары тысячы ўлётак

Лідэра АГП затрымалі 2 снежня ў Астраўцы, дзе палітык раздаваў друкаваную прадукцыю адносна страйку прадпрымальнікаў і супраць будаўніцтва АЭС. Падчас вобшуку машыны былі канфіскаваныя 1500 улётак і 25 дыскаў з перадачамі «Белсату». Уся гэтая прадукцыя будзе праходзіць экспертызу наконт наяўнасці ў ёй антыдзяржаўнага зместу.

### Адным мірам мазаны

Прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес заявіў, што будзе зноў дабівацца зменаў у канстытуцыю, якія дазволілі б яму зноў балатавацца на пасаду лідэра краіны да 2021 года. Чавес заявіў сваім прыхільнікам на мітынгу ў Каракасе, што пытанне пра адмену ліміту кадэнцый прэзідэнта тэрмінаў, якія адзін і той жа чалавек можа знаходзіцца на прэзідэнцкай пасадзе, павінна быць зноў вынесена на рэферэндум. Не ён першы так захацеў...

### Клінтан будзе дзяржсакратаркай ЗША

Новаабраны прэзідэнт ЗША Барак Абама на адмысловай прэс-канферэнцыі ў панядзелак паведаміў, што Хілары Клінтан прызначаная на пасаду дзяржаўнага сакратара. Робэрт Гейтс, які ўзначальваў Пентагон пры Джорджу Бушу, захавае сваю пасаду і ў новай амерыканскай адміністрацыі.

**ЗП, БелаПАН, Бі-бі-сі**

# Новы перадзел Расіі

**«Знешэканомбанк» Расіі пераймае кантроль над самымі ласымі заводамі. А хто старшыня назіральнай рады ВЭБу? Уладзімір Пуцін. Піша ў расійскім выданні gazeta.ru Аляксей Міхайлаў.**

У верасні ў выніку сусветнага крызісу расійскія мільярдэры страцілі трэць уласнасці. Іх кампаніі набралі крэдытаў, а плаціць няма чым. Крах. Каб захаваць хоць нешта, прадпрымальнікі гатовыя ісці на саступкі тым, хто дае грошы. А грошы мае дзяржава. Пераразмеркаванне прыватнай уласнасці ідзе без наўпростай нацыяналізацыі, але з дапамогай дзяржкампаній. Добраахвотнае, але па цэнах у 4, 10 і 100 разоў ніжэйшых, чым тыя, па якіх уласнікі бізнесу адмаўляліся яго прадаць год таму.

Найбольш магутны інструмент пераразмеркавання, што знаходзіцца ў руках ураду, — «Знешэканомбанк» (ВЭБ). Велізарныя рычагі ўплыву на гэты працэс ёсць і ў руках «Цэнтрабанку» Расіі (ЦБР).

Галоўныя падзеі ў частцы перадзелу ўласнасці наперадзе, і звязаныя яны з будучай дэвальвацыяй, якая прывядзе да вялікіх праблемаў банкаў, будаўнічых кампаній, тураператараў.

Пазыкі расійскіх кампаній і банкаў складаюць $500 млрд. Магчымасці іх рэфінансавання з дапамогай заходніх крэдытаў практычна няма. Таму быў прыняты закон аб размяшчэнні ў ВЭБе дэпазіту ад Банку Расіі на $50 млрд і прадастаўленні за яго кошт крэдытаў для рэфінансавання расійскіх кампаній і банкаў.

На якіх умовах дае крэдыты ВЭБ?

Што звяртае увагу — гэта шырокія паўнамоцтвы банку ў дачыненні да даўжнікоў. Застава передаецца ВЭБ, агульны памер крэдытных ставак з пазычальнікаў не павінен перавышаць $2,5 млрд (але быў перавышаны пры выдачы крэдыту кампаніям Алега Дзерыпаскі ў $4,5 млрд);

ВЭБу даецца права безакцэптнага спісання сродкаў для пагашэння крэдыту з любых рахункаў пазычальніка; без згоды ВЭБу пазычальнік не можа прыцягнуць крэдыт ці выпусціць каштоўныя паперы; без згоды ВЭБу немагчыма прадаць (закласці) маёмасць у памеры больш за 10% актываў пазычальніка, абавязковае ўключэнне прадстаўнікоў банку, а таксама рэкамендаваных ім кандыдатаў у органы кіравання пазычальніка (у выпадку з пазыкай для унікальнага камбінату «Нарнікель» прадстаўнік дзяржавы ўключаецца ў раду дырэктароў не пазычальніка, а «Нарнікелю». Прычым мае найвышэйшую пасаду.)

Паўнамоцтвы ВЭБу куды большыя, чым у кансорцыумаў заходніх банкаў, што пракрэдытавалі расійскія кампаніі. Яны нават выходзяць за рамкі трымальніка блокпакету акцый, хоць акцыянерам ён не становіцца. І практычна нічым не абмежаваныя.

Захоча ВЭБ — задаволіцца цяперашняй заставай для перафінансавання кампаній, захоча — пашырыць яе. Захоча — дасць пагасіць пазыку, а можа аўтаматычна спісваць грошы з рахункаў даўжніка.

Такія паўнамоцтвы, відавочна, выходзяць за рамкі банкаўскай дзейнасці і адкрываюць прастор для прыняцця «палітычных» рашэнняў пра лёс кантрольных пакетаў найбуйнейшых расійскіх прадпрыемстваў, якія апынуцца ў распараджэнні ВЭБу.

У красавіку «Русал» Дзерыпаскі набыў у Прохарава пакет акцый «Нарыльскага нікелю» памерам 25% +2 акцыі за $7 млрд і 11% акцый «Русалу». На гэтыя мэты «Русал» узяў сіндыкаваны крэдыт у заходніх банкаў аб'ёмам $4,5 млрд, заклаўшы 13% акцый. З часу заключэння ўгоды кошт акцый «Нарнікелю» ўпаў больш чым удвая. Financial Times пісала, што патрабаванні да даплаты былі да $4 млрд. Пагасіць патрабаванні крэдытораў удалося, павялічыўшы прадмет заставы да 25%.

Гэтага замала. «Русал» звярнуўся ў ВЭБ. Рашэнне прынялі аператыўна. Цяпер акцыі, якія паўгоду таму былі больш за $14 млрд, перададзеныя ў залог ВЭБу за $4,5 млрд. У «Русалу» практычна няма шанцаў выкупіць пакет у ВЭБу — ён усё яшчэ вінны Прохараву $2,5 млрд (ці 4% акцый «Русалу»).

Другая вядомая ўгода ВЭБу. У 2007 г. «Альфа-груп» заклала ўвесь свой пакет у «Вымпелкоме» (44%) пад два выпускі аблігацый, выкупленых лонданскім філіялам Deutsche Bank. У кастрычніку праз зніжэнне каціровак «Вымпелкому» ўзніклі ўмовы, што дазвалялі банку патрабаваць датэрміновага пагашэння пазыкаў. «Альфа» атрымала крэдыт у ВЭБе. На канец кастрычніка кошт 44% «Вымпелкому» па цэнах НЁФБ складаў больш за $5 млрд. У канцы 2007 г. гэты пакет каштаваў болей за $20 млрд. Ён закладзены ў ВЭБе за $2 млрд.

Як бачым, даўжнікі ў адчайнай сітуацыі. Яны самі прыйшлі ў ВЭБ і гатовыя на самыя кабальныя ўмовы.

Але хто распараджаецца працэсам выдачы крэдытаў ВЭБу? Назіральная рада банку. Яе старшыня — Уладзімір Пуцін.

Таму ВЭБ набывае буйныя пакеты акцый кампаній праз выдачу крэдытаў за кошт валютных рэзерваў Банку Расіі. Атрымаюць кампаніі гэтыя заставы ці не — паглядзім праз год. Але гэта — праца «вялікімі мазкамі». А ёсць яшчэ інструмент «тонкай настройкі». ВЭБу дадзена 6,4 млрд даляраў са сродкаў Фонду нацыянальнага дабрабыту да канца году на «падтрымку расійскага фондавага рынку». Да канца лістапада палова ўжо патрачана.

# Нацыяналісты — гэта хто?

**Беларус па-беларуску ў Беларусі — нацыяналіст. Добра. А паляк па-польску ў Польшчы? Выходзіць, таксама нацыяналіст? Піша Сяргей Дубавец.**

Глядзеў я дзіцячае Еўрабачанне і разважаў над сваім улюбёным моўным пытаннем. Чаму ўсе дзеці спяваюць на мове сваіх краін і толькі беларусы — на мове суседняй? Вось у мяне і літоўцы знаёмыя пра гэта пытаюцца, і палякі, і ўкраінцы, і нават расійцы, а мне адказаць няма чаго. Нават сорамна неяк перад суседзямі робіцца. І так я гэтым разам рассароміўся, што вырашыў — ну ўсё, калі нашы нарэшце заспяваюць па-беларуску, пашлю за іх 10 sms, хто б там і пра што ні спяваў. Абы мне больш не чырванець. А калі раптам зноў па-расейску, аддам свае эсэмэскі таму, хто проста найбольш спадабаецца.

А пытанне сапраўды складанае. Колькі пра яго ні пішуць, а яно ўсё стаіць і стаіць. Ну, дапусцім, гавораць нашы артысты ў жыцці па-расійску. Іх права. Абы ім ды іхняму атачэнню камфортна было, і ўсе ўсіх разумелі. Але калі на выездзе — зусім іншая сітуацыя. Асабліва ў гасцях у нашых суседзяў, якія вякамі цярпелі ад русіфікацыі і таму надта ж капрызліва ставяцца да той мовы, на якой ты да іх звяртаешся.

Кажуць, на нядаўнім урачыстым з'ездзе Саюдзісу ў Літве быў канфуз. Усе госці выступалі па-літоўску (як маглі, памылкі даруюцца), у крайнім выпадку па-англійску (прыгнёту з боку Вялікабрытаніі на памяці літоўцаў не было). А Саюдзіс, як вы ведаеце, гэта такі літоўскі рух, які прывёў літоўцаў да незалежнасці ад Расіі. І тут выходзіць з прывітаннем наш Станіслаў Станіслававіч і «на чистом русском языке...». Ну ясна, што зразумелі яго, бо самі многія ўмеюць па-расійску. Але ж маветон! Віншаваць з вызваленнем ад русіфікацыі па-расійску...

Не асвісталі яго, праўда. Падумалі, ну гэта ж братка-беларус, ён і так такі рахманы і забіты, ну, не спадобіўся тры словы хоць бы на роднай сваёй мове сказаць. А ў Вільні, між іншага, па-беларуску разумеюць не горш, чым па-расійску. Бо наша — адна з тутэйшых моваў спрадвеку.

Ага, дык я наконт артыстаў. Неяк у нас у Беларусі лічыцца, што калі ты «несанкцыянавана» гаворыш па-беларуску, дык, хутчэй за ўсё, — нацыяналіст. Беларус па-беларуску ў Беларусі — нацыяналіст. Добра. А паляк па-польску ў Польшчы? Выходзіць, таксама нацыяналіст? Ну, пра літоўца я і не пытаюся, ён у нас у прынцыпе нацыяналіст. Ух, у крыві ў яго гэта дзела! І ў эстонца таксама. Ок. А калі француз у Францыі па-французску? Як бы гэта так сказаць... Нацыяналіст, але, прынамсі, нейтральны, не са знакам мінус, проста нацыяналіст. Ідзем далей. А расіец у Расіі калі па-расійску гаворыць, ён — хто? Проста харошы чалавек? Нармальны такі сам па сабе. Ну, як жа інакш расійскаму чалавеку ў Расіі размаўляць, як не па-расійску? Значыць, не нацыяналіст? А чым жа ён горшы за немца ці француза? Ці — лепшы?

Ведаеце, я ўсё ж савецкую школу скончаў у горадзе Мінску. Шмат там дураты было, але тое, што ўсе народы роўныя, я яшчэ тады засвоіў і да сёння ў гэтым перакананы. Няма ні горшых, ні лепшых, і ўсе маюць аднолькавае права — так нас вучылі.

Атрымліваецца, што і расіец, які ў Расіі па-расійску, — нацыяналіст, хай сабе з самым вялікім плюсам. Але — нацыяналіст. Як літовец у Літве ці венгр у сваёй Венгрыі. Усе — нацыяналісты! І беларус, які ў Беларусі па-беларуску, за іх нічым не горшы і не лепшы. Правільна? Правільна.

А хто тады такі беларус, які ў Беларусі — па-расійску? Не нацыяналіст? А хто, калі мы высветлілі, што ўсе нармальныя народы на сваёй зямлі — нацыяналісты? Можа, ён — расійскі нацыяналіст? Толькі не трэба пра тое, што беларус і сам не ведае, хто ён. Можа і не ведае, але адчувае гэтую няхручнасць вельмі моцна.

Нездарма пры перапісах насельніцтва абсалютная большасць нашых нібыта рускамоўных беларусаў роднай мовай называюць беларускую. І такім чынам ці то грэх з душы здымаюць, ці то ўладам намякаюць, маўляў, пара б ужо і нам станавіцца нармальнымі нацыяналістамі. Без гвалту, натуральна. Бо кожны хай гаворыць, як хоча, а вось улады павінны гаварыць прынамсі на дзвюх мовах. І артыстам, якія прадстаўляюць нашу краіну на міжнародных конкурсах, варта было б падумаць, за што іх будуць паважаць яшчэ больш і яшчэ больш эсэмэсак насыплюць.

Вядома, дзеці тут ні пры чым. Калі яны вырастуць, дык зразумеюць, што «цягнулі» на міжнародным конкурсе «за дваіх», бо дарослыя дзядзі і цёці пазбавілі іх часткі той адметнасці, якая ў іншых, можа быць, і стала апошняй кропелькай перамогі. Нашы бедныя «дзвюхжыльныя» дзеці! Нават перамагаць умудраюцца ў такіх умовах. Толькі не галасаваць жа за вярыгі там, дзе трэба галасаваць за радасць.

Ну вось, такія справы. Як і абяцаў, гэтым разам свае 10 sms я паслаў з літоўскай тэрыторыі за Грузію. Не таму, што мне іх прэзідэнт падабаецца. Ніякай палітыкі. Проста нумар быў найлепшы. І па-грузінску.

**Naviny.by**

**Сяргей Дубавец**

пісьменнік, журналіст, выдавец. Былы рэдактар газет «Свабода» (1990) і «Наша Ніва» (1991).

# У Мінску абвешчана стварэнне ўраду падкарпацкіх русінаў

Актывісты руху падкарпацкіх русінаў правялі ў Мінску слуханні «Падкарпацкая Русь і Рускі свет». На іх быў абраны ўрад аўтаномнай рэспублікі Падкарпацкая Русь. Русінамі называе сябе частка жыхароў Закарпацця, дзе размаўляюць на адметным дыялекце.

25 кастрычніка ў Мукачаве адбыўся II Кангрэс падкарпацкіх русінаў, на якім быў падпісаны мемарандум аб узнаўленні русінскай дзяржаўнасці. Уступленне дакументу ў сілу было адкладзена да 1 снежня.

Да гэтага часу, на думку русінаў, украінскія ўлады павінны былі пачаць працэс прызнання аўтаномнай рэспублікі Падкарпацкая Русь. Не атрымаўшы адказу ад афіцыйнага Кіева, русіны сабраліся ў Мінску і абвясцілі пра стварэнне ўраду з 50 чалавек.

Удзельнікі мінскага сходу таксама звярнуліся да парламентаў Расіі і Беларусі з просьбай разгледзець пытанне аб праве русінаў на самавызначэнне.

Аднак, паводле словаў старшыні камісіі ў міжнародных справах і сувязях з СНД палаты прадстаўнікоў Сяргея Маскевіча, такая заява да беларускіх парламентарыяў яшчэ не прыходзіла. Таксама палітык назваў абуральным сам факт правядзення русінскіх слуханняў на тэрыторыі Беларусі.

Кангрэс падкарпацкіх русінаў фінансуе Масква, і ён дабіваецца аддзялення ад Украіны. Ёсць і іншыя плыні русінаў, якія выступаюць за адзінства Украіны.

**АГ; Еўрарадыё**




Беларус апынуўся ў цэнтры вялікага футбольнага скандалу.

# Ковель спатыкнення

22-гадовы беларускі нападнік раменскага «Сатурну» і нацыянальнай зборнай Леанід Ковель апынуўся ў эпіцэнтры скандалу. Эпапея з ягоным пераходам з львоўскіх «Карпат» у падмаскоўны клуб нарэшце пачынае праясняцца.

У пятніцу на сайце украінскай каманды з'явілася афіцыйнае рашэнне ФІФА, што «кантрактныя абавязкі між «Карпатамі» і Ковелем дзейнічаюць да 31 снежня 2011 году».

Скандал разгарэўся яшчэ мінулай зімой, калі Ковель падпісаў доўгатэрміновы кантракт з расійскай камандай. Прычым прадало яго ў «Сатурн» мінскае «Дынама». «Карпаты» ж сцвярджалі, што перавялі грошы мінчанам за футбаліста яшчэ задоўга да гэтага, а 31 снежня Ковель падпісаў кантракт менавіта з львоўцамі. Сам беларус кажа, што ў гэты дзень быў у Мінску і чыста фізічна не змог бы паставіць подпіс пад новым пагадненнем.



Агенты футбаліста кажуць, што Ковелю маглі падсунуць дакумент пад відам нейкіх іншых папер. «Карпаты» ж падалі скаргу ў ФІФА. Футбаліст у шматлікіх інтэрв'ю сцвярджаў, што кіраўніцтва «Карпатаў» — «страшныя людзі».

Напэўна, за мінулы год пра справу паспелі ўжо забыцца. Пры канцы сезону Ковель змог замацавацца ў асноўным складзе падмаскоўнай каманды, а таксама атрымаў запрашэнне ў нацыянальную зборную. І цяпер вось такі паварот.

Самае цікавае, што рашэнне ФІФА датаванае яшчэ 21 жніўня, але агучанае яно было толькі цяпер. У Беларускую федэрацыю футболу адпаведны факс з ФІФА не паступаў.

Разам з тым, у рашэнні сусветнай федэрацыі не паведамляецца, ці будуць ужытыя супраць футбаліста нейкія карныя захады, ці будзе ён дыскваліфікаваны.

Справа ў тым, што апошнія гады бюракраты-функцыянеры ФІФА стараюцца пазбягаць гучных скандалаў. Напэўна, яны разлічваюць, што бакі змогуць разысціся палюбоўна і цяпер.

Дарэчы, сусветны фінансавы крызіс дакаціўся і да цяперашняй каманды Ковеля. У аўторак было абвешчана, што дзве падмаскоўныя каманды «Сатурн» і «Хімкі» аб'ядноўваюцца ў адну, якая будзе мець назву «Сатурн Юнайтэд». У складзе гэтых каманд апроч Ковеля гуляюць яшчэ два беларусы — Уладзімір Юрчанка і Арцём Радзькоў.

**Зміцер Панкавец**

**Леанід Ковель**

Нарадзіўся ў 1986 годзе ў Смаргоні. Выхаванец мясцовай футбольнай СДЮШ. Выступаў за менскае «Дынама», львоўскія «Карпаты». Цяпер гулец раменскага «Сатурна». За нацыянальную зборную Беларусі правёў 5 матчаў, забіў 2 галы.

## СЦІСЛА

### У царкве павесілі ікону Сталіна

Настаяцель храму ў Стрэльне, пад Пецярбургам, выставіў абраз з выявай Іосіфа Сталіна ў мундзіры на фоне купалаў храму Васілія Блажэннага. Аднак ідэя настаяцеля выклікала гнеў прыхаджанаў, якія заявілі, што не будуць хадзіць на службы. Адрэагавала і царкоўнае начальства, і ікону знялі.

### У праваслаўных Піліпаўка, у каталікоў Адвент

З 27 лістапада ў праваслаўных вернікаў пачаўся Піліпаўскі пост, які быў уведзены ў IV—V стагоддзях для падрыхтоўкі да святкавання Раства Хрыстовага. У каталікоў Адвент (з лац. adventus — чаканне, прыйсце) пачынае літургічны год. У першыя вякі хрысціянства Адвент працягваўся толькі два тыдні, аднак падчас пантыфікату папы Грыгорыя Вялікага гэты перыяд павялічыўся да чатырох тыдняў, да 25 снежня.

### Ой, ляцелі гусі

Рада рэспубліканскай грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» прыняла рашэнне абвясціць птушкай 2009-шэрую гусь.

### Спартыўнага каналу пакуль не будзе

Пра гэта паведаміў намеснік галоўнага дырэктара дырэкцыі Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Капёнкін. «На жаль, у свеце няма ніводнага спартыўнага каналу, які мае прыбытак або хаця б самаакупны», — зазначыў ён.

### Літоўцы не хочуць быць Усходняй Еўропай

Такія вынікі апытання, праведзенага кампаніяй Vilmorus на замову ўрадавай канцылярыі. 41% удзельнікаў гэтага апытання хацелі б, каб Літва асацыявалася з краінамі Паўночнай Еўропы — Швецыяй, Даніяй, Фінляндыяй, Нарвегіяй.

### Поўны аблом

У Калінкавічах распачатая крымінальная справа ў дачыненні да кантралёра «Беларусбанку», якая выкрала больш за 300 латарэйных білетаў на суму звыш 1 мільёна 200 тысяч рублёў. Як патлумачыла падазраваная следству, запазычанасць яна мела намер пагасіць шляхам выйгрышу ў «Суперлато», але гэта ёй не ўдалося.

### Крышціяну Раналду стаў уладальнікам «Залатога Мяча»

Паўабаронца «Манчэстэр Юнайтэд» названы найлепшым еўрапейскім гульцом паводле версіі часопісу France Football. Раналду набраў 446 балаў, а форвард «Барселоны» Ліянэль Мэсі і форвард «Ліверпулю» Фернанда Торэс занялі 2-е і 3-е месцы, набраўшы 281 і 179 пунктаў адпаведна. Раналду на першае месца паставілі 77 з 96 чалавек.

### Прэзерватыў як сродак агітацыі

Актывісты «Руху «За Свабоду» у рамках інфармацыйнай кампаніі «За еўрапейскую Мастоўшчыну» правялі ў Мастах акцыю, прымеркаваную да Дня барацьбы са СНІДам. Яны раздалі на дыскатэцы ў раённым доме культуры і ў танцавальным клубе 150 прэзерватываў з заклікам «Мы супраць СНІДу».

**АГ, «Звязда», ru.delfi.lt, БелаПАН, InoPressa.ru**

# Беларускі кухонны шэпт

**Усё часцей у публічных месцах можна пабачыць, як людзі, што нейкі час нармальна гутарылі, раптоўна прыкладаюць руку да вуснаў і нахіляюцца да вуха суразмоўцы. Піша Руслан Равяка.**

Апошнім часам беларусы прыглушаюць голас, калі хочуць нешта сказаць важнае. Гэта вярнулася ў краіну разам з савецкай спадчынай. Разам з чуткамі-плёткамі, гутаркамі на кухні, недагаворкамі.

Ужо не чуваць голасныя спрэчкі ў публічных месцах — у аўтобусах, на прыпынках, у чэргах. Гавораць пра знаёмых, надвор'е, здароўе. Пра дактароў таксама гавораць прыглушана — раптам побач які доктар. Калі ж гамонка тычыцца нечага... Аглядаюцца па баках, прыглушаюць голас. Гэтае вечнае беларускае шаптанне заўважаюць і замежнікі.

Пачуўшы беларускую мову, твае знаёмыя счакаюць, пакуль побач нікога не будзе, і, прыцішыўшы голас, паведамяць, што таксама галасавалі за Мілінкевіча, Пазняка, «Пяцёрку +»... што некалі чыталі «Народную волю», чулі «Свабоду» ці глядзелі ў знаёмых «Белсат».

Шэптам табе па шчырасці прызнаецца чыноўнік, што ён таксама за мову і каб «гэты маразм скончыўся».

Прасты люд напаўголасу пляткарыць пра начальства. Начальства — пра дурны народ, што пасля дэкрэтаў строчыць скаргі і турбуе рознай лухтою. Старшыня ўчастковай камісіі ціха пажаліцца другому — во, выбары прайшлі, і ўжо ўсе пра нас забыліся...

Усе зразумелі, што публічныя выказванні могуць прывесці да скасавання кантрактаў, пераводу на горшае месца, трапляння дзяцей у чорны спіс. Але ж карціць выгаварыцца, чэшацца язык. Як у тым купэ з выпадковым чалавекам.

Трэба толькі нахіліцца бліжэй, каб ніхто чужы не пачуў.

*Баранавічы*

# Першы акт марлезонскага балету

**Пацяпленне адносінаў з Еўропай яшчэ не раз зменіцца пахаладаннем, а лібералізацыя — рэпрэсіямі. Піша Аляксандр Класкоўскі.**

Славутай дарожнай карты — плану пакрокавай нармалізацыі дачыненняў між Беларуссю ды Еўрасаюзам — ніхто дасюль у вочы не бачыў.

Дыялог Захаду з тутэйшай уладай надта празрыстым не назавеш. Аднак Еўропа «зліла» змест прапановаў афіцыйнага Мінску — таго хатняга задання, што ён гатовы выканаць, каб 13 красавіка 2009 году Брусель не размарозіў візавых санкцый супраць высокага чынавенства. Пытанне: ці выканае?

З Мінску ў еўрапейскія структуры 19 лістапада пайшла папера з абяцаннем:

— падрабязна абмеркаваць з БДІПЧ АБСЕ рэкамендацыі датычна паляпшэння Выбарчага кодэксу;

— вярнуць у распаўсюд «Народную волю» ды «Нашу Ніву»;

— узяць пад увагу вынікі круглага стала пад эгідай Міністэрства інфармацыі і АБСЕ, прысвечанага пытанням заканадаўчага рэгулявання дзейнасці інтэрнэт-СМІ.

Што маем у сухой астачы на сёння?

Самы канкрэтны пункт — другі. Тут працэс пайшоў. Ашчасліўленыя рэдакцыі (якія пасля «выкіндэсу» незалежнай прэсы з каталогаў ды шапікаў перад выбарамі-2006 амаль тры гады мусілі ладзіць распаўсюд саматужна) падпісваюць дамовы з поштай і саюздрукам. Апальныя друкаваныя брэнды вось-вось з'явяцца ў кіёсках. Дарэчы, калі іх выкідалі, то ўсё падавалася як «стасункі гаспадарчых суб'ектаў»: маўляў, эканамічна нявыгадна...

Цяпер мы бачым, хто ў нас вырашае, быць ці не быць недзяржаўнай прэсе ў нацыянальных сетках распаўсюду.

Зрэшты, дзеля свабоды СМІ дозу такога «валюнтарызму адлігі» можна пертрываць. Іншая рэч, што рашэнне палавінчастае. За бортам застаюцца яшчэ многія выданні — ад левапазіцыйнага «Товарища» да рэгіянальных газет.

Аўтар гэтых радкоў днямі меў магчымасць асабіста запытацца ў галоўнага ідэолага дзяржавы сп.Янчэўскага пра лёс астатніх рэпрэсаваных медыяў. Адказ быў: пабачым!

Ну што ж, пабачым.

Мой дыялог з кіраўніком ідэалагічнай управы прэзідэнцкай адміністрацыі адбыўся ў кулуарах таго самага круглага стала пра свабоду інтэрнэту, вынікі якога афіцыйны Мінск абяцае ўлічыць. Аддамо належнае: прадстаўнікам незалежнай медыйнай супольнасці цягам дыскусіі ніхто не затыкаў рот (гэта, канечне, норма, але для нас — дзіва).

Бальшыня экспертаў аргументавана давяла, што чыноўніцкі сверб «зарэгістраваць інтэрнэт» — справа безнадзейная, як намер меліярацыйнай канторы асушыць частку Сусветнага акіяну. Грубае адміністраванне хіба што выцісне інтэрнэт-медыі з «.by» у іншыя дамены (шукай ветру ў полі!) ды азмрочыць імідж афіцыйнага Мінску як «ворага свабоды». Цяпер слова за ўладай. На добры лад, варта было б скасаваць шэраг рэпрэсіўных артыкулаў Закону пра СМІ. Бюро прадстаўніка АБСЕ ў пытаннях свабоды СМІ гатовае за мілую душу кансультаваць тут беларускую ўладу. Зноў жа — каб тая толькі захацела...

Ну а самыя цьмяныя перспектывы — у пытанні дэмакратызацыі выбарчага заканадаўства.

Тут, па-першае, можна расцягнуць справу на ўзор стварэння канстытуцыйнага акту саюзнае дзяржавы: больш гумавага працэсу ў сучаснай гісторыі, мусіць, няма. Па-другое, і тут варта чакаць мікраскапічных саступак. Ну зробяць, напрыклад, чатыры дні датэрміновага галасавання замест пяці.

З іншага боку, рыхтуецца сказаць сваё слова апазіцыя. Яна наважылася «прабіць» уласны праект змен у выбарчае заканадаўства. Дасюль усе спробы рэалізаваць права грамадзян на заканадаўчую ініцыятыву (зарэгістраваць ініцыятыўную групу, сабраць 50 000 подпісаў, атрымаць ухвалу Мін'юсту на праект, унесці ў парламент і г.д.) чынавенства спыняла адным пальчыкам. Фармальную зачэпку знайсці — бы раз плюнуць. Як будзе зараз?

Відавочна, што мяч на баку ўладаў. Сказаўшы «а», трэба сказаць «б». Натуральна, варта чакаць, што, перафразуючы Ільфа і Пятрова, за кожны скормлены Брюселю вітамін Мінск будзе патрабаваць мноства (і зусім не дробных) паслуг.

Шмат што залежыць ад прынцыповасці ЕС.

Цяпер мы назіраем першы акт марлезонскага балету, калі беларускія і еўрасаюзаўскія чыноўнікі дэманструюць вербальнае братанне. Але варта чорнай котцы праскочыць між Мінскам і Бруселем — і ў нас можа пачацца ранейшая душылаўка. Ніводзін рэпрэсіўны механізм не зламаны. Таму звышзадача — дамагацца мінімальна прыстойных рамкавых умоваў для палітычнага, медыйнага плюралізму, развіцця грамадзянскай супольнасці.

Дыялог ЕС з Мінскам мусіць стаць болей празрыстым. Каб у Бруселю не было спакусы «зліваць» балючыя для беларускай дэмакратычнай грамадскасці пытанні, ставячы фармальныя птушачкі ў адпаведных графах. Кшталту: круглы стол праведзены — птушачка, паехалі далей.

Бо далёка не ад'едзем на адных прыгожых словах нашага начальства, пракансультаванага лордам Бэлам на прадмет максімальнага ўжывання ліберальнай лексікі.

# Еўрастабільнасць для Беларусі

**Працяг са старонкі 2.**

літыка Усходняга партнёрства — гэта максімум таго, што мы можам паабяцаць сёння Азербайджану, Арменіі, Беларусі, Грузіі, Малдове і Украіне. Пра сяброўства ў ЕС для гэтых краінаў гаворкі пакуль няма. Для Украіны гэта — вялікае расчараванне, а вось для Беларусі нават такая прапанова — сапраўдны прарыў на міжнародным фронце. Калі яшчэ колькі дзён таму формула палітыкі Усходняга партнёрства мела выгляд 5 +/- 1 (адзінка, якая ніяк не можа вызначыцца, адпавядала Беларусі), то на прэс-канферэнцыі 3 снежня Старшыня Еўракамісіі адназначна заявіў: «Мы прапануем амбіцыйную стратэгію для шасці партнёраў».

Што канкрэтна атрымае Беларусь ад удзелу ў гэтай праграме? «Гэта партнёрства не толькі для дзяржаваў, але і для грамадскай супольнасці, бізнесу, асобных грамадзянаў», — запэўніла Беніта Ферэра-Вальднэр. Нашая краіна будзе мець шырэйшы ды лягчэйшы доступ да еўрапейскага рынку. Будзе спрашчацца візавы рэжым — ажно да адмены візаў (гэта канчатковая мэта для ўсіх удзельнікаў палітыкі Усходняга партнёрства). Рабочым будзе лягчэй паехаць на заробкі ў Еўрасаюз, каб карміць свае сем'і, а ўладальнікам малых ды сярэдніх бізнесаў будуць усяляк дапамагаць развіваць іх справы. Нашых чыноўнікаў будуць вучыць розуму на стажыроўках ў еўрапейскіх інстытуцыях. Будзе ствараецца «Паўднёвы энергетычны калідор», які дапаможа ЕС і ўдзельнікам палітыкі Усходняга партнёрства мець большую пэўнасць у тым, што ім не перакрыюць газ у зімовыя маразы... І гэта толькі вельмі прыблізны і няпоўны пералік шматлікіх прапановаў, многія з якіх сапраўды надта прывабныя.

Што патрабуецца ад Беларусі, каб яна здолела ўзяць удзел у гэтай ініцыятыве? Натуральна, папершае, яе кіраўніцтва павінна прынцыпова вырашыць, што яно жадае ў ёй ўдзельнічаць. Дарэчы, 2 снежня пасол Беларусі ўжо меў у Брусэлі гутарку з прадстаўнікамі Еўракамісіі на тэму Усходняга партнёрства. Але аднаго жадання далучыцца будзе замала — кіраўніцтву Беларусі трэба пачаць паводзіць сябе мінімальна цывілізавана. Па-першае, выпусціць усіх палітвязняў і не саджаць у турмы новых, па-другое, палепшыць стан сродкаў масавай інфармацыі, патрэцяе, весці дыялог з Еўропай наконт удасканалення выбарчага заканадаўства, па-чацвертае, палепшыць умовы існавання грамадскай супольнасці, па-пятае, рабіць крокі да таго, каб забяспечваць свабоду асацыяцыі ды мірных сходаў.

Як бачна, усе крытэры выканання гэтых патрабаванняў (апрача, хіба, першага) можна трактаваць досыць вольна. Паверакы ў справах прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Беларусі Жан-Эрык Хольцапфель тлумачыць гэта тым, што Еўрасаюз вырашыў карыстацца ў дачыненнях з афіцыйным Мінскам не пакрокавай стратэгіяй, а гнуткім інструментам, які дазволіць дасягнуць рэальных вынікаў. Можна меркаваць, што, калі Аляксандр Лукашэнка здолее «пратрымацца» да чэрвеня 2009 г. без радыкальнага «закручвання гаек», то ён мае ўсе шанцы з фурорам наведаць устаноўчы саміт Усходняга партнёрства, адчуць сябе на роўных з заходняй палітычнай элітай.

Ці здолее беларускі ўрад наважыцца на гульню паводле еўрапейскіх правілаў? Для ліберальнага крыла паноўных элітаў гэта можа быць шанцам перайсці на новы ўзровень, захаваць, а, магчыма, нават і пашырыць свой уплыў у краіне, прасекчы акно на заходнія рынкі. Натуральна, патрэба дазволіць пэўную долю свабодаў стварае для рэжыму значны дыскамфорт. Але сёння, калі эканамічны крызіс павольна, але няўмольна бярэ краіну ў абцугі, перспектыва нестабільнасці ў краіне робіцца яшчэ страшнейшай. Еўропа прапануе дапамагчы захаваць стабільнасць у Беларусі — чаму б з гэтага не скарыстацца?

Натуральна, пры ўсім падабенстве лозунгаў «стабільнасць, дабрабыт, эфектыўнае кіраванне», ёсць адно істотнае адрозненне: у адным выпадку ў глянцаванай абгортцы ідэалагічных абяцанак-цацанак ляжыць гаркавая пігулка аўтарытарызму, а ў другім — цукерка дэмакратыі, якая, зрэшты, таксама не кожнаму будзе да смаку. Але выбіраць паміж імі, так ці інакш, давядзецца.

**Алесь Кудрыцкі**

# Беларуса-палітуцекача забілі і парэзалі на кавалкі

**21 кастрычніка чэшская паліцыя ў аэрапорце Прагі Рузіне арыштавала двух мужчынаў, якія падазраюцца ў забойстве беларуса Канстанціна Раманюка.**

Найхутчэй, што абодва арыштаваныя з'яўляюцца грамадзянамі Казахстану. Яны прыляцелі ў Прагу з Масквы. Арышт для іх быў поўнай нечаканасцю, яны спрабавалі супраціўляцца.

28 жніўня ў пражскім раёне Мале Хухле супрацоўнікі службы сартавання адкідаў знайшлі ампутаваную чалавечую руку. Пазней паліцэйскі патруль у Госціваскай плаціне знайшоў ступак ад правай нагі. На абедзвюх частках цела былі практычна аднолькавыя разрэзы.

Следства і генетычная экспертыза высветлілі, што часткі цела належаць знікламу без вестак 24-гадоваму беларусу Канстанціну Раманюку **(на фота)**, які раней атрымаў у Чэхіі статус палітуцекача. У вышук Раманюк быў абвешчаны яшчэ 27 жніўня, за дзень да знаходжання адной з частак цела.

Парэшткі хлопца не так даўно былі пахаваныя на ягонай радзіме ў мястэчку Бобр Крупскага раёну. Канстанцін быў адзіным дзіцем у сям'і.



Паводле нашай інфармацыі, Раманюк фактычна не ўдзельнічаў у палітычным жыцці. Толькі аднойчы запомніўся акцыяй з вывешваннем бел-чырвона-белага сцягу над будынкам спіртзаводу ў Добрушы.

Прычыны эміграцыі былі хутчэй эканамічныя — ягоную фірму абклалі вялікімі штрафамі. Перацягнуў Канстанцін да сябе ў Прагу і дзяўчыну з Жодзіна.

У Празе ён жыў ужо трэці год. З прадстаўнікамі эміграцыі ён таксама амаль не кантактаваў.

**Зміцер Панкавец**

# З шанцамі на ўсплыццё

Аляксандр Лукашэнка вызваліў ад пасадаў чатырох супрацоўнікаў Міністэрства ўнутраных справаў: генерал-маёра Аляксандра Шчурка, першага намесніка міністра ўнутраных справаў — начальніка крымінальнай міліцыі, генерал-маёра міліцыі Віктара Філістовіча, намесніка міністра ўнутраных справаў — начальніка галоўнага ўпраўлення кадраў, палкоўніка Віктара Мельнікава — начальніка Дэпартаменту фінансаў і тылу МУС, палкоўніка Лідзію Іванчыкаву — начальніка Дэпартаменту па грамадзянстве і міграцыі.

Усіх чатырох падазраюць у незаконным атрыманні кавалкаў зямлі ў лесе над Заслаўскім вадасховішчам.

Іх не пасадзілі, як бывала калісьці ў такіх выпадках. У адпаведнасці з указамі ўсе яны перададзеныя ў распараджэнне міністра ўнутраных справаў. Гэта азначае, што яны могуць усплыць на іншых пасадах. А вось у дамах будуць жыць іншыя людзі.

**Мікола Бугай**




**Гэтыя катэджы належаць звольненым генералам і палкоўнікам міліцыі. Нічога асаблівага, як на цяперашнія часы. Калі не лічыць таго, што дзялянкі зямлі на беразе Мінскага мора каштуюць сотні тысячаў даляраў, а чыноўнікі іх адхапілі за 10—25 тысяч рублёў.**



# Ганіце баксы

Цана бензіну ў рублях знізілася на 10%, а ў далярах — аж на 22%.

Калі сусветныя цэны на нафту знізіліся з 140 даляраў да 50, «Белнафтахім» палічыў, што час бензіну таннець і ў Беларусі. Праўда, не ўтрая, а толькі на 10%.

Такім чынам, кошт бензіну А-76 (Н-80) складае ад 1 снежня 1760 руб. за літр, бензіну АІ-92 — 2220 руб., бензіну АІ-95 — 2530 руб., дызпаліва — 2020 руб.

Найбольш цікава, што новыя цэны на паліва моцна розняцца ў рублях і далярах ЗША. Цана бензіну ў рублях знізілася на 10%, а ў далярах — аж на 22%. Напрыклад, 95-ы — з $1,34 да $1,04 за літр. «Бензінавы» курс рубля да даляра складае, такім чынам, больш за 2400 руб.

Раней рублёвыя цэны вылічваліся па дзейным курсе рубля да валюты. Цяпер «Белнафтахім» упершыню ўсталяваў фіксаваныя цэны ў далярах.

Гэта зроблена, каб кампенсаваць дэфіцыт валюты. Дзяржава разлічвае, што людзі пачнуць плаціць за паліва ў далярах, а не ў рублях. Крок беспрэцэдэнтны. Ён паказвае, наколькі бракуе валюты ў краіне.

Камерцыйным запраўкам дазволілі выстаўляць цэны ў еўра ды рублях самастойна. Яны пераважна трохі вышэйшыя за цэны на дзяржаўных АЗС, дзе цэны ў рублях і еўра пералічаныя зыходзячы з курсу, закладзенага ў даляравую цану.

**МБ**

**Колькі каштуе паліва ў суседніх краінах?**

| | Даляраў, за літр 95–га бензіну, у сярэднім | Сярэдні заробак |
|---|---|---|
| Мінск, Беларусь | 1,17/1,04 | 450 |
| Варшава, Польшча | 1,27 | 1200 |
| Вільня, Літва | 1,00 | 850 |
| Рыга, Латвія | 1,02 | 900 |
| Масква, Расія | 0,85 | 680 |
| Кіеў, Украіна | 0,73 | 340 |

## Справа Андропава жыве і квітнее

Камітэт дзяржаўнага кантролю адсачыў, калі беларускія чыноўнікі прыходзяць на працу.

За два дні, 25-26 лістапада, кантралёры праверылі 119 арганізацый і ўстаноў. Выявілі больш за 400 чалавек, якія спазніліся.

На службу ў Міністэрства спорту і турызму не спяшаўся кожны шосты супрацоўнік. Позніцца на працу чыноўнікі з міністэрстваў адукацыі, юстыцыі, эканомікі, інфармацыі.

У Барысаўскім райвыканкаме кантралёры налічылі 30 чыноўнікаў, якія спазніліся, у Мінскім — 13, Маладзечанскім — 10.

Старшыня Камітэту дзяржкантролю Зянон Ломаць паабяцаў пракантраляваць, як пакараюць непунктуальных.

Падобныя праверкі практыкаваліся ў СССР у пачатку 80-х у часы Андропава. Тады кантралёры рабілі ў працоўны час аблавы нават у кінатэатрах і цырульнях. Тады савецкай эканоміцы ўсё гэта памагло як мёртваму прыпаркі.

**ЗП**




## Лукашэнка на каляндарыках

Такі кішэнны каляндарык атрымліваюць у падарунак прызыўнікі аднаго з мінскіх ваенкаматаў. Ужо другі год запар ён друкуецца з асабістай ініцыятывы армейскага начальніка найвышэйшага звяна.

**«Салідарнасць»**

# N.R.M., «Класік-Авангард», Раман Падаляка і Святлана Зелянкоўская ў ролі Максіма

**10 снежня на вялікай сцэне Філармоніі ў мегапраекце Ларысы Сімаковіч, прысвечаным Максіму Багдановічу. Удзельнікі праекту — фальклор-тэатр «Госціца» Ларысы Сімаковіч, ансамбль салістаў «Класік-Авангард», Лявон Вольскі і N.R.M., артысты мінскіх тэатраў Святлана Зелянкоўская, Раман Падаляка, Міхаіл Зуй — прэзентуюць містэрыю «Дзень Максіма».**

Гэты музычна-пластычны спектакль складаецца з дзевяці навелаў, аб'яднаных скразным вобразам Максіма Багдановіча. Разам з сваімі персанажамі — русалкамі, вадзянікамі, лесунамі, Моцартам і Сальеры — паэт прыходзіць у сённяшні час, сустракаецца з вулічнымі музыкамі-рэперамі, Лявонам Вольскім і гуртом N.R.M., тэатрам «Госціца», рэжысёрам Міколам Пінігіным. Прагучаць і новыя песні на вершы Багдановіча ў выкананні гурту In Search For («У пошуку»).

Танец, жывы гук, аўтэнтыку, сучасныя рытмы, класіку яднае высокая паэзія і сучасная містэрыя пад назвай «Дзень Максіма Багдановіча».

**АБ**

# Чаму жанчына грае мужчыну

**Інтэрв'ю з акторкай Святланай Зелянкоўскай, якая ў містэрыі «Дзень Максіма» сыграе ролю Багдановіча.**

**«Наша Ніва»: Святлана, пасля такіх інтрыгоўных анонсаў Вашага спектаклю публіка ў трымценні. Апавядзіце хоць трошкі пра сам мюзікл, прыадчыніце заслону.**

**Святлана Зелянкоўская:** Ой, не люблю я слова «мюзікл». Мы ставім хутчэй музычную містэрыю. Драматычныя акцёры, рокавыя і фолкавыя гурты сабраліся, каб сыграць на сцэне дзевяць караценькіх гісторый-прыпавесцяў, якія адбываюцца не толькі ў мінулым, у часы нашага паэта Максіма Багдановіча, але і ў сучаснасці. Усе ўрыўкі звязаныя паміж сабой сэнсава. Сама я буду граць Максіма Багдановіча.

**«НН»: Чаму менавіта Максім Багдановіч, а не, да прыкладу, Купала?**

**СЗ:** А я думала, Вы мяне найперш спытаецe, чаму жанчына грае мужчыну (смяецца). Што ж, Максім Багдановіч — таямніца нашай культуры. Ягоная такая непадобная да іншых творчасць (калі браць пад увагу ягоных сучаснікаў), ягоная заўчасная смерць, эратызм ягоных твораў — усё гэта прычына таго, што ягонае імя вабіць нават праз сто гадоў. Ён мае свой неразгаданы культурны код. І па сённяшніх вуліцах ходзяць маладыя мастакі, Максімавы нашчадкі, якія гэтаксама, як Багдановіч, хочуць ствараць. Таму, акрамя Максіма, я буду граць самую сябе, акторку Святлану Зелянкоўскую.

**«НН»: Заблыталі вы ўсё... Вы ж Максім, вы ж і Святлана?! Каго ж у гэтым выпадку грае Лявон Вольскі?**

> У нашай містэрыі Лявону Вольскаму выпала граць... самога Лявона Вольскага.

**СЗ:** Не паверыце, пасля шматлікіх пераўвасабленняў, якія зазнаў Лявон цягам сваёй творчай кар'еры, у нашай містэрыі Лявону Вольскаму выпала граць... самога Лявона Вольскага.

**«НН»: Гэта не першае Вашае пераўвасабленне ў гістарычную асобу. Шырокай публіцы вы запомніліся роляй Настассі Слуцкай у аднайменным фільме. Як паўплываў удзел у ім на Вашую кар'еру?**

**СЗ:** Хутчэй адмоўна. Склаўся нейкі стэрэатып пра мае акторскія магчымасці. Два гады я сядзела амаль без сур'ёзных прапановаў. Але цяпер крызіс пераадолены. Таму «Дзень Максіма» — гэта яшчэ і мой дзень.

**«НН»: Пасля «Настассі Слуцкай» Вас на вуліцы часта пазнаюць?**

**СЗ:** Бывае. Хаця падабенства паміж маім вобразам і мною ў жыцці амаль не праглядаецца. Настасся ж такая ўся з сябе. Велічная, уладная. Адным словам, княгіня. Я ж асабіста люблю разняволены стыль. Хоць, бывае, ідзеш сабе няспешна па Мінску, і тут раптам людзі падбягаюць, аўтограф просяць.

**«НН»: Пасля скандалу ў Купалаўскім, адстаўкі гендырэктара Кірычэнкі якая цяпер атмасфера ў тэатры?**

**СЗ:** Працоўная атмасфера. А большасць навінаў я даведваюся ад вас, журналістаў. У нас тут іншае выпрабаванне, лютае. Знакаміты будынак Купалаўскага тэатру неўзабаве будуць рэстаўраваць. Вось гэта турбуе найбольш.

**«НН»: А з «Максімам» па Беларусі не жадаеце паездзіць?**

**СЗ:** Пакуль усе думкі адно пра прэм'еру. Мы ўсе вельмі хвалюемся. Гэты спектакль — ініцыятыва найперш творчай групы, дык мы павінны былі рупіцца пра ўсё — нават пра распаўсюд квіткоў. Таму пакуль што зарана нешта казаць. Сыграем прэм'еру — а там пабачым.

**Гутарыў Павал Касцюкевіч**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Святлану Зелянкоўскую творчасць Багдановіча вабіць непадобнасцю да сучаснікаў і эратызмам.**

**Прэм'ера спектаклю «Дзень Максіма»**

пройдзе 10 снежня ў Вялікай зале Белдзяржфілармоніі (пр.Незалежнасці, 50). Пачатак у 19.00.

**Дыялог ля білетнай касы**

**Мужчына:** «Максім». Два білеты.

**Прадавачка:** Хіба Максім прыязджае ў Мінск? Нешта я не чула...

**Мужчына:** Не, не тая Максім. Два білеты на нашага Максіма, Максіма Багдановіча.

## Во дзе крэатыўнасць!

**Анонс на ТБ: «Беларускаму камсамолу — 90 гадоў».** Але ж у 1918-м сапраўды адбыўся Першы Ўсерасійскі з'езд моладзі. Але прычым тут Беларусь? На нашай тэрыторыі тады існавала Беларуская Народная Рэспубліка. Звяртаемся далей да гісторыі. У 1991 г. XXX з'езд ЛКСМБ перайменаваў рэспубліканскую камсамольскую арганізацыю ў Саюз моладзі Беларусі. У 1992 годзе на I устаноўчым з'ездзе прыхільнікаў камуністычнага кірунку ЛКСМБ адроджаны як палітычная арганізацыя моладзі Беларусі, і па стане на 1 студзеня 1998 г. налічвае 1200 сяброў. Гэтыя дадзеныя з энцыклапедыі. Арганізацыя БРСМ утварылася ў 2002 годзе, а ўжо, паводле ТБ, мае паўмільёна сяброў і праводзіць саракавы з'езд. Во дзе крэатыўнасць!

Нават правапераемнік усея і ўсяго — Расія на камсамол так апантана не кваліцца. Такі фальш адчуваецца на ўзроўні падсвядомасці, і маладыя нават не заўважаюць намаганняў ужо не надта маладых дзядзькаў і цётак. Каб гэтую энергію ды на карысць справы! А рэчаіснасць выглядае так: моладзь (асабліва з навучальных установаў, бо з імі прасцей) скопам заганяюць на нейкія сходы, там яны галасуюць за нейкія прапановы, выбіраюць нейкіх дэлегатаў, ім расказваюць пра нейкія лагеры, якіх яны не бачылі. Кіраўнік аднаго з прадпрыемстваў горада так і сказаў майму сябру: «Уступайце ў БРСМ ці шукайце працу». Дык чаго вы хочаце ад звычайных грамадзянаў гэтай краіны, калі вам проста маняць у твар і ў такіх маштабах!

**Сяргей Брадавы, Маладзечна**

## Падзяліся родным словам

**У 18 гарадах Беларусі пачалася грамадская акцыя «Падорым дзіцячым дамам-інтэрнатам літаратуру на роднай мове».** На сёння бібліятэкі дзіцячых дамоў ды інтэрнатаў маюць сціплыя фонды. У найлепшым выпадку беларуская мова там прадстаўленая выданнямі савецкага часу. Маладыя неабыякавыя людзі захацелі даць магчымасць дзецям з малых гадоў чытаць сучасныя, цікавыя і карысныя беларускія кніжкі. Па Мінску ўжо сабрана пад 400 кніжак, па Мінскай вобласці — больш за 200. Ініцыятары акцыі заклікаюць усіх неабыякавых далучацца. Звязацца з каардынатарамі можна праз сайт www.belkniha.org. Кантактныя тэлефоны: (029) 370-02-04 (Ян), (029) 705-50-71 (Хрысціна). А можна і самастойна, без усякіх акцыяў, занесці некалькі беларускіх кніжак у бібліятэку найбліжэйшага дзіцячага дому.

**ВА, ЮМ, Мінск**

## Дзе тут будзеш багаты

**У нас на кожным рагу крычаць пра энергазберажэнне. Але ж рэчаіснасць паказвае далёка не тое.** Возьмем нашу Бягомльшчыну. Стаяць у Бягомлі два пяціпавярховыя дамы. Кацельня, якая абслугоўвае гэтыя дамы, працуе на дровах. Раней там былі катлы, што працавалі на мазуце. Яны давалі вельмі высокую тэмпературу. Потым праз дарагавізну расейскай нафты катлы замянілі. Адзін з тых старых катлоў купіла дарожнабудаўнічая арганізацыя. А другі так і стаіць на двары, яго з'ядае іржа. А гэта ж вельмі каштоўнае абсталяванне. Няўжо нельга яго прадаць туды, дзе ён будзе прыносіць карысць?

А яшчэ ад неразумнага планавання ідзе вялікі перарасход дроваў, бо жыллё, пабудаванае яшчэ за часамі СССР, слаба трымае цяпло. Няўжо начальнікі думаюць, што лес бясконцы? Я не вінавачу мясцовую ўладу, таму што на іх ціснуць зверху, яны не ведаюць, што найперш рабіць, але такая сітуацыя не толькі ў нас, але і шмат дзе ў Беларусі. Глядзіш на гэта і думаеш, ці ж будзем мы багатыя. Пакуль што не.

**Сяргей Ц., Бягомль**

## Ці салодка жывецца беларускай вёсцы?

**Напэўна, кожны з вас ведае пра адзін з найбольшых калгасаў краіны «Прагрэс Верцялішкі».** І тыя, хто быў там, памятаюць, што па прыгажосці і ўтульнасці гэтае месца можа канкураваць не толькі з вёскамі, але і з некаторымі з гарадоў. Аднак звернем увагу на тыя вёскі, якія знаходзяцца ўдалечыні ад цэнтру гэтага калгасу, але усё ж такі адносяцца да яго.

Вось, напрыклад, Рыдзялі. У гэтай вёсцы жывуць людзі, што калісьці па дванаццаць гадзінаў на дзень працавалі на палях раней названага калгасу. Але як жывуць? У хатах, што ледзь ліпеюць. Дарога ў гэтай вёсцы дарогай завецца толькі фармальна. І зробленая яна так, што варта пайсці дажджу, як вада цячэ проста на падворак старым людзям, хаты якіх ад старасці аселі так, што вокны ў зямлю ўраслі. Вось і ўявіце сабе: цёплым летам, калі вокны адчыненыя, пачынаецца дождж. Мала таго, што падворак на працягу некалькіх дзён будзе заліты вадою, дык яшчэ потым давядзецца сушыць прамоклую ў час дажджу падлогу. І гэта ўсё ў 80 гадоў!

Але працягнем. Вось старому чалавеку з сапсаваным здароўем стала кепска. Што ён будзе рабіць? Як паказвае практыка, у гэтай вёсцы старыя людзі прымаюць мноства розных таблетак і кладуцца ў ложак, гаворачы «а раптам лягчэй зробіцца», а калі нават «дасць Бог не памру». А чаго ж так? На ўсю вёску прыходзіцца 2—3 тэлефоны. А пра ваду і газ зусім казаць няма чаго. І, як бачна, ніхто не спяшаецца абставіны змяняць. Ды і для чаго? Скаргаў няма. Куды ім, старым, заявы пісаць? А маладыя самі сабе ўсё пабудуюць.

Але ж хто старым дапаможа? Хто пра іх паклапоціцца? Напэўна, толькі анёл-ахоўнік.

З верай у перамены да лепшага,

**Asia**




**Аж сем разоў сустракаецца фота аднаго палітыка на вось гэткім «праваслаўным» календары. Здымак даслаў Алег Маркевіч.**

## ЧЫТАЦКІЯ ВОДГУКІ НА САЙЦЕ NN.BY

**...на пазоў у суд, пададзены жыхаром Віцебску Сяргеем Каваленкам, з патрабаваннем пакараць вытворцаў гарэлкі «Бульбаш» за абразу нацыянальнай гордасці.**

**Minak**
Тых, каму падабаецца, назва гарэлкі «БульбашЪ», можна спытаць, ці даспадобы ім будзе, калі прадпрыемства выпусціць для расійцаў гарэлку «КацапЪ», для палякаў — «ПшекЪ і далей «ХохолЪ», «ЛабусЪ», «ЖидЪ пархатый»?

**kyiv-minsk**
Выдатна! Ані ўкраінцы, ані расійцы не здольныя да гэткае самаіроніі. Гэта як паказчык маральнага здароўя нацыі. Усё адно хахлоў усе называюць хахламі — чаму не скарыстацца раскручанай назвай для брэнду? У Кіеве «Бульбаш» — найлепшы падарунак, які выклікае не пагарду, а зайздрасць да беларусаў: «А вось жа ў нас паспрабуй назаві — такое пачнецца!» І гэта несвабода.

**Кейстут**
Што тычыцца менавіта «бульбаша», то я ніколі не чуў выкарыстання гэтай мянушкі ў мэтах зняважыць мяне як прадстаўніка нейкай непаўнавартаснай нацыі. Можа, не трэба выдумляць праблемы на роўным месцы?

**Саянаў**
Гэта ад маральнай прызвычаенасці. Гэтаксама спадар, які здолеў маральна прызвычаіцца да ласкавапяшчотнага да сябе звароту — «ідыётушка ты наш, крэтынушка». Усё залежыць ад самаацэнкі чалавека. А планка самаацэнкі не ёсць велічынёй пастаяннай. Пачынаецца з «паўжартоўных дробязяў», і як толькі чалавек падрыхтаваны ўжо маральна не бачыць «дробязяў» і спісваць усё на «паўжарт», з таго самага моманту планачка пайшла ўніз.

**Амсціславец**
Калі б проста «Бульбаш», то халера на яго, але ж вось гэтае «Ъ»!.. Сп.Сяргею Каваленку — рэспект і поўная падтрымка, паспрабую зрабіць тое самае. А потым яшчэ трэба будзе з «МанархЪ» разабрацца.

**Ліс**
Няма чаго піярыць зняважлівае стаўленне да беларусаў. Не ведаю, каб хтосьці з вялікай павагі беларуса клікаў бульбашом.

**Кнехт**
Куды глядзіць дзяржава? «Прэзідэнтамі» старшыняў называць забаронена, а «бульбашамі» абзываць беларусаў дазволена...

**...на публікацыю пра забастоўку студэнтаў італьянскага універсітэту Сап'енца**
Піша італьянка Лідыя Федэрыка Мацьтэлі, якая вывучае беларускую мову: «Калі ласка, беларускія студэнты: НЕ бярыце прыклад з нас! Ведаеце, што яны крычаць на ўвесь голас, нібы ўсе новыя Маякоўскія? Крычаць: «Мы не хочам ані Дзяржавы, ані Улады», «Мы хочам Камунізму», у іх герб — Серп і Молат (мо гэта вам, беларусам, нешта нагадвае?). Я там кожны дзень і магу сказаць — гэта ганьба, тое што яны робяць. Але для нас гэта не навіна — я там правучылася шэсць гадоў, факультэт акупавалі за гэты час разы чатыры. А калі быць «жывым» — значыць піць, курыць і скончыць факультэт за 8 гадоў (калі нармальна было б за пяць)?.. Вядома, не ўсе такія. Ёсць і сапраўды палітычна свядомыя. Але ў нас ва універах дыктатура: альбо ты камуніст — альбо ніхто. Вашыя жывыя студэнты жывыя толькі каб гаварыць пра Леніна і ягонае значэнне ў гісторыі камуністычнай думкі (мы ў 2008 годзе!) У нас у Італіі людзі палітычна актыўныя, і студэнты вельмі, але... не думайце, што гэта заўсёды так добра. Калі Папа не мог гаварыць, я была там, пратэставала супраць пратэсту... але хто нас слухаў? Усіх спалохалі студэнты-камуністы. Ой, я люблю палітычную італьянскую актыўнасць, але не такую».



26 лістапада споўнілася 78 гадоў ад нараджэння **Уладзіміра Караткевіча**.

## КАЛЯНДАР

# Уладзімір Караткевіч. Беларуская песня

Дзе мой край? Там, дзе вечную песню пяе Белавежа,
Там, дзе Нёман на захадзе помніць варожую кроў,
Дзе на ўзвышшах Наваградскіх дрэмлюць суровыя вежы
І вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокі Дняпро.
Ты ляжыш там, дзе сіняя Прыпяць ласкава віецца,
Дзе Сафія плыве над Дзвіною, нібы карабель...
Там, дзе сэрца маё з першым крокам, як молат, заб'ецца,
Калі б нават сляпым і глухім я прыйшоў да цябе.
Што сляпым? Нават мёртвым успомню высокія зоры,
Над ракою чырвоной і цмяной палёт кажаноў,
Белы ветразь на сініх, на горды, як мора, азёрах,
І бары-акіяны, і неба — разлівы ільноў.
Дзе мой край? Там, дзе людзі ніколі не будуць рабамі,
Што за поліўку носяць ярмо ў безнадзейнай турме,
Дзе асілкі-хлапцы маладымі ўзрастаюць дубамі,
А мужчыны, як скалы, — ударыш, і зломіцца меч.
Дзе мой край? Там, дзе мудрыя продкі у хвоях паснулі,
Дзе жанчыны, як радасны сон у стагах на зары,
А дзяўчаты, як дождж залаты. А сівыя матулі,
Як жніўё з павуціннем і добрае сонца ўгары.
Там звіняць неўміручыя песні на поўныя грудзі,
Там спрадвеку гучыць мая мова, булатны клінок.
Тая гордая мова, якую й тады не забудзем,
Калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок.
Ты — наш край. Ты — чырвоная груша над дзедаўскім домам,
Лістападаўскіх зьнічак густых фасфарычная рать,
Ты — наш сцяг, што нікому, нікому на свеце, нікому
Не дамо абсмяяць, апаганіць, забіць ці мячом зваяваць.
Мы клянёмся табе баразной сваёй першай на полі
І апошняй раллёй, на якую ўпадзём у журбе.
Мы клянёмся табе, што ніколі,
Ніколі,
Ніколі,
Так,
Ніколі не кінем,
Не кінем,
Не кінем цябе.



ЮЛІЯ РУЖАЧКА

# Удвая больш «Народнага альбому»

Канцэрты «Народнага альбому», мяркуючы па ажыятажы ля касаў, здольныя сёння збіраць вялікія пляцоўкі. Аднак для гэтага праекту найлепш падыходзяць камерныя памяшканні — сцэна Купалаўскага тэатру або Малая зала «Казы», як часам пяшчотна называюць КЗ «Мінск».

Які канцэрт без спазнення? Зала поўная людзей, час пачынаць, а на сцэне — адно крэслы замест артыстаў. Хтосьці з гледачоў з першага шэрагу паклаў у капялюх, што ляжаў на сцэне сярод інструментаў, тысячную купюру.

Музыкі нібы чакалі гэтага знаку. Загучалі «Пад прыгнётам панскім», «Маладое піва». «Матку Боску Вастрабрамскую» выйшла співаць Вераніка Круглова, якая дзеля канцэртаў адмыслова прыехала з Берліну. Вераніка відавочна радавалася мінскай публіцы.

Калі Лявон Вольскі і таварышы хвацка адспявалі «Эх, змагаліся...», Міхал Анемпадыстаў маралізатарскім тонам нагадаў у мікрафон, што шмат піць дрэнна і так зусім нельга рабіць. Увогуле, аўтар тэкстаў «Народнага альбому» многа маралізаваў. Тое ж «нельга» ён сказаў і пра «Кантрабандыста», чым выклікаў абурэнне Касі Камоцкай: «Свабодная Еўропа! Палякаў пазбавілі занятку, які яны дзесяцігоддзямі рабілі з душой!». Лявон Вольскі супакоіў Касю, маўляў, не той ужо час на дворы, эканамічны крызіс, разумееце. Пад націскам Анемпадыстава музыкі згадзіліся і са шкоднасцю шпіянажу. Чым далей, тым часцей паміж песнямі музыкі спрачаліся і жартавалі, перамаўляліся з залай, аж пакуль Лявон Вольскі не прапанаваў зладзіць ток-шоў.

«А зараз народная песня, адна з дзвюх народных у гэтым альбоме, астатнія — антынародныя» — анансаваў жыдоўскую «Lomir zech iberbetn» Анемпадыстаў. На крэсла ўссеўся Аляксандр Памідораў і радасна адзначыў наяўнасць ахвяравання ў капелюшы...

Звыклага перапынку на месцы, дзе «большасць некалі перакладала касету», не было. Недзе пасля «Аргентынскага танга» спадар Міхал расказаў коратка пра кампанію «Будзьма!», пры падтрымцы якой адбыўся канцэрт. Пісьменніку Уладзіміру Арлову і мастаку Змітру Герасімовічу былі прэзентаваныя фірмовыя торбы кампаніі з боханамі хлеба. Такім чынам быў уганараваны плён іх працы — кніга «Краіна Беларусь».

Потым зала сустракала Казіка ды Юзіка, паміж якімі на «лузе» адбылася «бітва дабра са злом». Дзякуючы Аляксандру Памідораму рэпавыя матывы надзейна прыжыліся ў «Народным альбоме». Апошнія радкі «Надзенькі» спявалі ўсёй заляй колькі разоў. «Снежань, студзень і люты» выканала Круглова, скончыўшы песню гуллівым «ча-ча-ча». «Майскую песню» яна спявала побач з Вайцюшкевічам. Задумаўшыся, мабыць, пра нешта сваё, дадала лішняе «раз-два-тры». Зміцер не разгубіўся і падтрымаў былую жонку: «айн-цвай-драй». «Простыя словы» зала прымала стоячы, атрымаўшы ў падарунак кароткі паўтор насамрэч народнай песні. Але ўгаварыць музыкаў на большае не ўдалося: «Прыходзьце заўтра, дарагія сябры!» Бо сёлета ўдзельнікі «Народнага альбому» паламалі традыцыю выступаць раз на год. І надалей яны абяцаюць даваць па некалькі канцэртаў. Мо і за Мінск выедуць нарэшце?

Бо «Альбом», якому перавалiла ўжо за дзесяць гадоў, застаецца адным з самых чаканых і запатрабаваных імпрэзаў. Дзіва: людзі ідуць на яго, хоць дакладна ведаюць, якія песні і ў чым выкананні пачуюць. Адна з прычынаў — многія грамадскія і палітычныя праблемы, якія чаплялі беларусаў у часы санацыйнай «панскай Польшчы», абыграныя ў «Альбоме», яшчэ не зжытыя. А маральныя — дык не будуць зжытыя ніколі. Таму «Народны альбом» вечны. Рыхтуйцеся, музыкі!

**Сямён Печанко**

# Купалаўскі тэатр зачыняць на год

Будынак Нацыянальнага акадэмічнага тэатру імя Янкі Купалы ад другой паловы 2009 году становіцца на рэканструкцыю. Акцёраў чакае шлях брэменскіх музыкаў. Купалаўцы будуць вымушаныя выступаць на «выязных» сцэнах: Палацу культуры прафсаюзаў, Палацу чыгуначнікаў і клубу імя Дзяржынскага. «Міністэрства надзвычайных сітуацыяў не задавальняе цяперашні стан будынку з гледзішча пажарнай бяспекі, і таму рэканструкцыя проста неабходная», — кажа былы гендырэктар тэатру Мікалай Кірычэнка.

Разглядаюць розныя планы рэканструкцыі. Нават такі, паводле якога фасаду вернуць першапачатковы выгляд. Тады не было бакавых крылаў і на другім паверсе наведнікі маглі выходзіць на прыгожую тэрасу. А ззаду — наадварот: мяркуецца зрабіць прыбудовы, бо акцёрам не стае месца, і ў дадатак паводле тэхнікі бяспекі павінна быць некалькі выхадаў проці цяперашняга аднаго. На паддашку арыгінальныя, драўляныя, кроквы і перакрыцці заменяць на бетонныя.

Будынак Купалаўскага тэатру — гістарычная каштоўнасць. У 1917 г. тут праходзіў лёсавызначальны для незалежнасці Першы Усебеларускі кангрэс. На падмостках Купалаўскага ступалі ўсе зоркі беларускага тэатру, тут выступалі таксама Камісаржэўская, трупа Меерхольда, чытаў свае творы пісьменнік Шалом-Алейхем.

З прычыны набліжэння рамонту рэпертуар скарочаны, але рэпетыцыя новых спектакляў ідзе. Да прыкладу, рыхтуецца «Знак бяды» паводле Васіля Быкава. З спектаклем працуе пастаноўшчык «Тутэйшых» Мікалай Пінігін. Ці паспее прэм’ера прайсці ў сценах Купалаўскага, ці ўжо ў выязной зале — невядома.

**Павал Касцюкевіч**


Купалаўскі да рэстаўрацыі (1950-я).

## Канцэрт Беларускага клубу лютністаў

Канцэрт Беларускага клубу лютністаў адбудзецца **6 снежня ў Музеі гісторы тэатральнай і музычнай культуры (Музычны завулак, 5). Пачатак а 16 гадзіне.** У праграме: Эрнст Готліб Барон «Арыя», менуэт невядомага аўтара з Стакгольмскага манускрыпту, «Падмiргнi, і яна пойдзе за табой» (жыга), фрагменты з Полацкага сшытка, Віленскі сшытак «Гальярда». Уваход па квітках на музейную экспазіцыю (каля 1500 руб.).

# Дакота напісала для Еўрабачання песню на беларускай мове

Спявачка ў апошні дзень падала заяўку на беларускі адбор да Еўрабачання. А заспяваць нечакана вырашыла на роднай мове. Тэкст для хіта напісаў паэт Глеб Лабадзенка.

У Беларусі спявачка выступае не часта. Хоць у Расіі 18-гадовая Дакота напраўду папулярная артыстка з фан-клубамі ў дзесятках гарадоў. Паўдзельнічаць у беларускім адборы яе пераканалі прадзюсеры і расійскі Першы канал, з якім у спявачкі падпісаны кантракт.

Дакота: «Я пабачыла, што за маёй спінай такая падтрымка, і вырашыла паспрабаваць. Песня ўжо амаль гатовая. Я праспяваю ад імя ўсіх дзяўчат і нявест, якія не дачакаліся каханых з вайны.Музыку напісала я, а тэкст — паэт Глеб Лабадзенка. У ягоныя словы я дадала нешта ад сябе, атрымаўся творчы тандэм».

Спявачка мяркуе, што надышоў час паказаць Еўропе, што ў нас ёсць родная мова і на ёй можна спяваць прыгожыя песні, а расійскія прадзюсеры падтрымалі гэтую ідэю Дакоты .

«Я была на Еўрабачанні ў Бялградзе, — узгадвае Дакота. — Тады я пачула нямала прыгожых песень на розных мовах. Краіны прадстаўлялі свае культуры. І мне стала крыўдна, што беларусы ўвесь час спяваюць па-англійску».

Гэта не першая беларускамоўная песня Дакоты. Спявачка напісала ўжо не адну кампазіцыю на роднай мове. Але яе фаны пакуль ніводнай з іх не чулі.

Беларускамоўных песень на адборы на Еўрабачанне няшмат. Як паведаміла прадзюсэр



Еўрафэсту Настасся Ціхановіч, «артысты пераважна выбіраюць англійскую мову». З асноўных канкурэнтаў Дакоты выступяць Пётра Ялфімаў, Гюнеш, гурт Litesound, Вольга Плотнікава, Аляксандр Патліс, — кажа Ціхановіч.

Беларусы яшчэ ні разу не вазілі на Еўрабачанне песень на роднай мове.

**Паводле Еўрарадыё**

## Дай дарогу!

Д.С.П.Г., Go–Records, 2008



Мясцовы каларыт, як у спеве пра недарэку, што скраў «смярдзючыя сардзіны» на «Санта–Брэмар».

Мілая і забаўная панк-споведзь ад зорак берасцейскага андэграўнду паявілася ў часы дэфіцыту на шчырую рок-музыку. Мала хто цяпер з такой свіноўскай адданасцю і хоеўскім пахвігізмам спявае пра лайдакоў, наркотаў ды абібокаў. Асабліва душэўна выходзіць, калі бярэцца мясцовы каларыт, як у загалоўным спеве пра таго недарэку, што скраў «смярдзючыя сардзіны» на «Санта-Брэмар». Юрык Стыльскі дае чаду, не шкадуючы ні сябе, ні (вушы) людзей. Ён то кідае праз сказ брыдкаслоўі, то гітарнага бруду дае, то ў рэгі схіляецца, з смяшком, канечне («марыяхуана: пяць год за паўстакана»). Лепей за «Дай дарогу!» у гэтай плыні ў Беларусі можа быць толькі «Голая манашка». Цяжка прыняць толькі апошнюю тройку рэміксаў ад 4Kuba. Не гарманіруюць яны з тэкстамі.

## Яўген Канавалаў і Віктар Сямашка

Блуканні, 2008, самвыдат



Абарыгенскія танцы пад «Лявоніху».

Сумесная праца гітарыста, што канструюе ракеты, і флейтыста, які працуе на радыё. Яўген Канавалаў — зорка беларускага року 1960-х (ён граў у першых беларускіх рок-гуртах «2+2», «Алгарытмы» і «Эльфы»). Ён выступае на блюзавых сэйшнах ды запісвае для сябе інструментальныя п’ескі. Віктар Сямашка вядзе самую цікавую музычную праграму ў айчынным FM-эфіры «Новая зямля». Іх «Блуканні» — для тых, хто любіць цягучыя інструментальныя развагі кшталту саўндтрэку Ніла Янга да фільму «Мярцвяк». Усяго на дыску «дзевяць спантанных імправізацыяў». Свядома Яўген і Віктар пазначылі трэкі толькі нумарамі — хай слухачы самі даюць ім назвы, бо такая музыка можа выклікаць розныя асацыяцыі. Назва самой працы тлумачыцца проста — Канавалаў з Сямашкам блукаюць па стылях, эпохах і часах. Да ўсяго пры запісе альбому былі скарыстаныя разнастайныя гукі: размова маленькай дзяўчынкі, гукі лесу ды арэляў, абарыгенскія танцы пад «Лявоніху» ды шмат яшчэ маласпалучальных між сабой рэчаў. Шукаць у «Блуканнях» логікі не варта. Трэба проста слухаць.

## Віталь Артыст

Не без білета, West Records, 2008



«Здыхлік супраць чалавека–пінгвіна», «Тэма хітрага даішніка», «Афрыканскі лес».

Лідэр «Без Білета» пашырыў межы ўласнай творчасці і запісаў альбом летуценнага электроннага інструменталу для вузкага кола аматараў. Часам зусім ужо нечакана філасофскага, як для лідэра поп-рокавага праекту. На гэтым дыску паўстае ўжо не Барзоў, але яшчэ не Курохін:). На дыску сабраныя трэкі, якія аніяк не ўкладаюцца ў канцэпцыю «Без Білета», напісаныя з камерцыйных (да тэлесерыялаў і рэкламы), сяброўскіх (для тэатру «Інжэст» і Сашы з Сірожам) матываў і душэўных памкненняў («Плошча Каліноўскага»). Тут сустракаюцца разважлівыя нью-эйджавыя рэчы («Дабрацца жывым»), спробы сябе ў буйных музычных жанрах (аркестровачка «Здыхлік супраць чалавека-пінгвіна»), іранічныя музычныя замалёўкі («Тэма хітрага даішніка») і медытатыўныя імправізацыі («Афрыканскі лес»). Ёсць месца і ўсходнім матывам («Любоў дракона»), і заходнім («Гэта ўсё глупства, Джоні»). У цэлым альбом мінорны паводле настрою, што падкрэсліваюць два слязлівыя трэкі пры канцы.

Асабістая падзяка за «Плошчу». Хоць назву трэку можна было напісаць па-чалавечы.

## The Stokes

Не замерзай, West Records, 2008



Шанцуе нахабным, а гэтага ў «стоксаў» удосталь.

Наваполацка-мінска-маскоўскі гурт выконвае просценькую рок-музыку з ухілам на баладнасць і з аглядкаю на канец 1980-х. Прычым, як з музычнага, так і з тэкставага гледзішча. Нетаропкія гітарныя сола, сакавітыя клавішы і драматызм у вакале. Хоць Стоксу не стае эмацыйнасці Банджові ды вобразнасці расійскіх рокераў (затое ўласцівы іхнім тэкстам загадны лад прысутнічае ледзь не ў кожным трэку — «Ідзі са мной», «Убегай», «Сустракай» ды г.д.). Альбом запісваўся фактычна ўжывую, але «стоксы» заўжды гучалі на канцэртах больш эмацыйна, а ў запісе часам надта ўжо блякла. У цэлым маглі б яны сысці за «мужчынскі» варыянт «Гораду 312», калі ўжо так ірвуцца ў расійскі шоу-біз, бо з боку прафесіяналізму ды падыходу аніякіх нараканняў няма. Але такіх гуртоў у Расіі немаведама колькі. Зрэшты, шанцуе нахабным, а гэтага ў «стоксаў» даволі :). З песень асабліва нічога не вылучаецца. Так Лёша Стокс і не напісаў за некалькі гадоў нічога лепей за «Под куполом небес».

## IQ48

Героі, West Records, 2008



Спробы зайсці на тэрыторыю сур’ёзнай паэзіі скончаюцца няўдачай.

IQ48 можна даравацьўсё недаравальнае іншым: і мавэтонаўскія цытаты з савецкіх кінафільмаў, і няроўны вакал, і нероўныя тэксты. Бо яны ствараюць настрой. Іх прэ, ад таго і прэшся сам. Здаровага нацыяналізму з часоў «Вар’ятаў» у IQ паболела заўважна, і музыкі цалкам адмовіліся ад расійскамоўных тэкстаў.

У новым альбоме «ласёў» два пачаткі — сцёбны і змагарскі. Праўда, часам спробы зайсці на тэрыторыю сур’ёзнай паэзіі скончаюцца няўдачай, як абсалютна пралётны нумар «Гэй, наперад». Гэтак дысгарманічна на словы Купалы яшчэ ніхто не пяяў. Але ў выпадку з кранальнымі вершамі Міхала Анемпадыстава «Святло ў цемры» і «Схаванае сэрца» — усё нармуль. Гэтыя два гожыя трэкі — галоўныя на альбоме. Звяртае ўвагу сур’ёзная да манументальнасці «Будзе вайна». Ці прыжывецца ў рэпертуары?

Самая душэўная песня альбому ідзе схаваным бонусам — запісаная ў акустыку і заспяваная на трасянцы «Чіво ты?»

**Сяргей Будкін**

# Аднагодак БНР

**«Шмат пражыў, а перажыў яшчэ болей», — кажа пра сябе Уладзімір Лялькоў, якому споўнілася 90 гадоў. Ягоны лёс — архетыповы для інтэлігента таго пакалення. Сын праведніка свету, «вораг народу», у вайну ён быў дырэктарам гімназіі ў Мар'інай Горцы, за што адседзеў у Інце амаль дзесяць гадоў. Піша Сямён Печанко.**


ЯРАСЛАЎ СЦЕШЫК

«Неяк я вярнуўся з школы, а ў хаце вэрхал, поўна чужых людзей. Маці ў слязах, кажа, што бацьку арыштавалі. Аказваецца, «камбедаўцы» прыйшлі выграбаць у нас хлеб. Кінуўся на аднаго з іх з палкай, але мяне выштурхалі ў сені. Там на вочы мне трапіў серп. Узяў я яго і распаласаваў самы вялікі мех з пшаніцай — ад верху да нізу. Было мне гадоў адзінаццаць ці дванаццаць», — прыгадаў спадар Уладзімір свой першы антысавецкі выступ. Канфлікт з савецкай уладай быў непазбежны, бо сям'я ягоная была адносна заможнай. Жылі на хутары, трымалі гаспадарку, а таму мелі што на стол пакласці ды на плечы апрануць. «Што казаць, дзяцінства ўспамінаю з радасцю, бо хоць і працаваць даводзілася, але і мелі з таго».

### Вучыўся і вучыў

Навуку ў сям'і цанілі. Бацька Кандрат меў школьную адукацыю, наймаўся да багацейшых хатнім настаўнікам. Працаваў у ксяндза, потым у бацюшкі. Жывучы ў апошняга, і веру страціў: бацюшка, які заклікаў людзей пасціцца, сабе ні ў чым не адмаўляў. Маці скончыла колькі класаў, была шчырай верніцай.

Пасля сямігодкі Уладзімір паступіў у Рагачоўскі Белпэдтэхнікум. Паралельна з тэхнікумам скончыў курсы выкладчыкаў беларускай мовы. А там і ў Камуністычны інстытут журналістыкі падаўся. Але правучыўся нядоўга — у інстытуце, як і паўсюль, адмянілі стыпендыю, а ў бацькоў, чыю гаспадарку падкасіла калектывізацыя, грошы браць не захацеў. Пайшоў настаўнічаць, перад вайной трапіў дырэктарам у няпоўную сярэднюю школу ў Балочу (сёння — Пухавіцкі раён). Прыкладна ў той жа час пачаў друкавацца ў мясцовай раёнцы.

### Дзесяць курэй ад каменданта Шульца

З пачаткам вайны з лесу пачалі завітваць партызаны. Адзін з іх, стары знаёмец, настойліва параіў спыніць навучанне, а каб паскорыць справу, паабяцаў спаліць школу. Давялося прыслухацца да парады. Да ўсяго, былы загадчык РАНА Мар'інай Горкі прапанаваў дырэктарства ў жаночай гімназіі. Тут вучыліся ў асноўным вучаніцы мясцовых школаў. Навучанне ратавала ад высылкі на працы ў Нямеччыну.

«Камендантам мястэчка быў былы нямецкі настаўнік Шульц. Гэта адчувалася, бо вельмі прыязна да нас ставіўся», — узгадвае сп.Лялькоў. Неяк пад Новы год настаўнікі захацелі арганізаваць святочны вечар. Пайшлі да каменданта, і той загадаў выдаць мех мукі на гарэлку і дзесяць курэй». Прамова ў навагоднюю ноч пра тое, як упёкся беларусам «бацька ўсіх народаў», яшчэ адгукнецца дырэктару гадамі лагеру.

«Няхай Бог абнясе беларусаў ад такога ліха, як тая вайна. Але разам з тым гады вайны былі зорным часам для беларускай мовы. У нашай гімназіі ўсе прадметы выкладаліся па-беларуску. Нават настаўнікі з Расіі мусілі вывучыць мову, каб выкладаць геаграфію ці прыродазнаўства», — кажа Уладзімір Лялькоў. А сярод выкладчыкаў былі розныя. Дзве маладыя настаўніцы, якіх узялі на працу, вельмі хутка пачалі сустракацца з нямецкімі афіцэрамі. «Зрабіў ім заўвагу, што кепскі прыклад даюць вучням, то паабяцалі перадаць мае словы куды трэба», — усміхаецца стары настаўнік.

Той жа камендант у 1944-м параіў з'ехаць з мястэчка. Па дарозе Уладзімір Кандратавіч вымушана раздзяліўся з сям'ёй і трапіў у Германію.

### Арышт, суд і турэмныя універсітэты

У Германіі Уладзімір не забавіўся. Фільтрацыйны лагер, дарога дамоў. На радзіме сустрэў заканчэнне вайны, уладкаваўся настаўнікам. Працаваў нядоўга. Неяк у 1946-м вярнуўся з працы. У хаце незнаёмыя мужчыны, сказалі, што трэба паехаць з імі ў Гомель на адмысловую камісію для тых, хто вярнуўся з Германіі. У Гомелі адзін з канваіраў з удаванай скрухай развёў рукамі: «Спазніліся на камісію, трэба ў Маскву». Слухаючы гэтую гісторыю, міжволі думаеш, што сённяшнія нашчадкі НКВД не здраджваюць «слаўным» традыцыям. У Маскве былога дырэктара гімназіі чакалі следчы трыбуналу Маскоўскай вайсковай акругі Хлебаў і начныя допыты. «Угаворваў падпісаць паперы, абяцаў, што выйду на свабоду і буду далей сабе пісаць вершы, бо віна мая невялікая», — прыгадвае Лялькоў. І дадае: «І я такі згадзіўся. А не трэба было таго рабіць. Некаторыя людзі былі шмат цвярдзейшыя, і хоць ледзь жывыя былі, але стаялі на сваім да апошняга». За супрацоўніцтва з акупацыйнымі ўладамі суд адмераў беларускаму настаўніку дваццаць пяць гадоў. Пачуўшы вырак, засмяяўся: «Праз дваццаць пяць гадоў ні вас, ні вашай улады ўжо не будзе!»

Пасля суду трапіў у Таганскую турму, якая запомнілася выключнай чысцінёй і нялюдзкай халаднэчай. Потым была Бутырка, сапраўдны універсітэт, як кажа Уладзімір Лялькоў: «З усяго тэрміну гэты быў найлепшы перыяд: тут была найбагацейшая бібліятэка, поўная рэдкіх выданняў мінулых стагоддзяў, цікавыя людзі — выкладчыкі, вядомыя на ўвесь свет музыкі, прафесар-егіптолаг, арыштаваны проста ў часе чарговай экспедыцыі». У 1947-м «навучанне» скончылася — прыйшоў час этапу ў Інту. Там акурат арганізавалі сумнавядомы Мінлаг.

### Дзякуй Мікіту

Лагер застаўся ў памяці надзвычай цяжкай працай на вугальных шахтах, чорнымі робамі, матрацамі, набітымі стружкай. У 1953-м, па смерці Сталіна, прыйшла палёгка — вязняў пачалі пераводзіць на вольнае пасяленне, сталі плаціць грошы. Да Лялькова прыехала жонка Соф'я. Ён на той момант працаваў настаўнікам. Вучыў расійскай мове ўсіх ахвотных — старых і маладых, вязняў і вольных. Пісаў у мясцовую газетку.

У 1956 г. суд перагледзеў справу У.Лялькова і пастанавіў вызваліць яго. Былы настаўнік дагэтуль удзячны Мікіту Хрушчову за вызваленне тысячаў рэпрэсаваных і за сваю асабістую волю.

Паўстала пытанне вяртання дамоў. Знаёмыя адгаворвалі. Казалі, маўляў, не думай, што ў Беларусі табе будзе лепей. Але там быў сын, дый жонка не хацела заставацца тут.

### Рэабілітацыі не падлягае

Па вяртанні на радзіму Лялькоў атрымаў I групу інваліднасці па зроку. Уладкаваўся на навучальна-вытворчае прадпрыемства Беларускага таварыства сляпых. За працай не забываўся на творчасць, пісаў вершы, аповесць. У пачатку 1970-х пайшлі з жонкай на пенсію. Дамовіліся ні дня больш не працаваць на дзяржаўнай працы. Набылі дамок ды заняліся гаспадаркай.

Незалежнасць сустрэлі з радасцю, але была яна, тая радасць, нядоўгай. «Як была Беларусь савецкай, так і за Лукашэнкам такой засталася. Беларусы вартыя лепшай улады» — упэўнены спадар Уладзімір.

На пачатку 1990-х прыйшоў адказ з Генпракуратуры на запыт пра рэабілітацыю. Былому дырэктару жаночай гімназіі адмовілі. Больш ён не пісаў заяваў: «Я не лічу сябе вінаватым ні перад народам, ні перад сваім сумленнем».

### Сын праведніка свету

І яшчэ адзін штрых да гісторыі Лялькоўых. У 2000 годзе бацьку і сястру Уладзіміра Вольгу прызналі праведнікамі свету. Усю вайну Кандрат Лялькоў хаваў стрыечных сёстраў-габрэек Галю і Маргарыту, а таксама мінскую габрэйку Разалію Драздоўскую. Аднойчы нехта данёс на Лялькова, і сёстраў адвезлі ў Карму на допыт. Дапамог родны дзядзька, што быў у Карме бурмістрам. Цяпер Галя і Маргарыта жывуць у Германіі, часта тэлефануюць Ляльковым у Мінск. Іх ратаўнік пражыў 103 гады. Дый спадар Уладзімір Кандратавіч на свае дзевяноста не выглядае. Трымаецца бадзёра, цікавіцца палітыкай, чытае газеты. І, як смяецца ягоны ўнук, атрымаў заданне ад родных калі не пераўзысці бацьку па даўгалецці, то хоць бы не саступіць яму. Застаецца толькі далучыцца да гэткіх пажаданняў.

**Уладзімір Лялькоў**

**нар. 26 кастрычніка 1918 г. на Рагачоўшчыне. У 1940—1941 гг. — дырэктар школы ў вёсцы Балоча (цяпер Пухавіцкі раён). У 1942—1944 гг. — дырэктар Мар'інагорскай народнай гімназіі. Арыштаваны ў 1947 г. Асуджаны трыбуналам войскаў МУС Маскоўскай акругі за «антысавецкую агітацыю» на 25 гадоў працоўна-папраўчых лагераў. Этапаваны ў Мінеральны лагер МУС Комі АССР (Інта). Вызвалены пастановай Вярхоўнага Савету СССР у 1956 г. На пенсіі як інвалід 1-й групы. Аўтар успамінаў. Ягонае апавяданне «Лёсы» друкавалася ў «НН» №48'2007.**


Вынаходнікі
А давайце што-небудзь змайструем!
Сябры змайстравалі робата
А што ён будзе рабіць?
Можа, дадзім яму лазерны пісталет?
Уключай!
СТАРТ!
Ба-бах!
Робат, што ты робіш?!
Выключай яго хутчэй!
Хопіць! Ніякіх больш пісталетаў!
Зусім іншая справа!
Капітан Танака

# Feel Brazil

**12—16 снежня ў менскім кінатэатры «Перамога» (вул.Інтэрнацыянальная, 20)** пройдзе фестываль бразільскага кіно. Гэта падарунак ад школы капаэйры FICAG усім, каму цікавая культура Бразыліі.

Прэзэнтаваныя на фэстывалі стужкі — шчырыя, вельмі эмацыйныя, недзе жорсткія, недзе занадта сэнтымэнтальныя. Досыць істотна розніцца ад звыклага галівудскага ці класічнага эўрапейскага кіно. Некаторыя фільмы могуць выклікаць адчуванне гіпэрбалы. Аднак бразыльцы кажуць, што рэжысёры наадварот, прымяншаюць, апісваючы іх жыццё.

На фэсце будуць паказаныя фільмы **«Два сыны Франсішка»** (12 снежня, 18.30, драма), **«Чалавек, які капіяваў»** (13 снежня, 17.00, камедыя), **«Гаспадыня лёсу»** (14 снежня, 17.00, 15 снежня, 19.00, рамантычная камедыя), **«Дзеты?»** (16 снежня, 19.00, камедыя).




## Шэдэўры нямецкага рамантызму



Музычныя шэдэўры нямецкага рамантызму — ад ранняга да позьняга — прагучаць у канцэрце Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі (мастацкі кіраўнік А.Анісімаў) **6 снежня а 19.00 у Вялікай зале Белдзяржфілармоніі**. Канцэрт для фартэпіяна з аркестрам Р.Шумана ў выкананні заслужанай артысткі Беларусі Ірыны Шумілінай, Канцэрт для фагота з аркестрам К.М.Вэбера ў выкананні лаўрэата міжнародных конкурсаў Аляксея Фралова **(на фота)** і знакаміты сімфанічны опус Рыхарда Штраўса «Так казаў Заратустра» прагучаць пад кіраўніцтвам нямецкага дырыжора Ёрга Івера.

## КАНЦЭРТЫ

### Дударскі фэст

Беларускія дудары распачынаюць новы сезон вечарынаў «Дударскага клубу» **ў мінскай кавярні «Бастыён» (Валгаградская, 35)**. **18 снежня** там зайграе **«Келіх кола»**, а **8 студзеня — «Расалія»**. Т.: (029) 66–36–879, (029) 553–03–47. Замова столікаў: (029) 627–27–21

### Folk the System

**У клубе «Гудвін» (пр.Незалежнасці, 19) 14 снежня** адбудзецца фестываль модэрн–фолк і фолк–рок–музыкі Folk the System. Бяруць удзел: **UNIA** (modern–folk, folk–rock), **Rockash** (neo–folk), **Litvintroll** (folk–metal), **AKANA-NHS** (ethno–jazz, world–music), **Гаротніца**, «Гродзень» (alternative ethno–core). **Пачатак а 19-й.** Квіткі: 17 000 папярэдне, 23 000 — у дзень канцэрту.

## ВЫСТАВЫ

### Свет шкла

**У мастацкім музеі да 10 студзеня** працуе выстава «Свет шкла», прысвечаная 125–годдзю з дня заснавання шклозаводу «Нёман». У экспазіцыі прадстаўлена больш за 300 вырабаў XX і пачатку XXI стагоддзя, а таксама некаторыя творы з прыватных калекцыяў.

### Важна ўсё

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 14 снежня** працуе выстава жывапісу Валянціна Губарава «Важна ўсё».

### Вобразы і падабенствы

**У Музеі гісторыі беларускай літаратуры (вул.Багдановіча, 13) з 6 снежня** працуе выстава «Вобразы і падабенствы». Вы можаце ўбачыць лялькі Ганны Балаш і працы фотамастака Данілы Парнюка.

### Выявы-2008

**6 снежня ў Тэатры рамансу (Чыгуначная, д. 27, корп. 2)** адбудзецца прэзентацыя літаратурна–мастацкага праекту «Выявы–2008». Удзельнічаюць Вольга Гапеева, Віка Трэнас, Валярына Кустава, Рагнед Малахоўскі. Маладыя паэты будуць не толькі чытаць вершы, але і пакажуць свае адмысловыя праграмы. **Пачатак а 18-й.** Квіткі 5000. Даведка і заказ квіткоў па т.: (029) 560–77–93, 135–44–95 або праз e–mail: vuavu@list.ru.

## КІНО

### Кінапаказ да Дня правоў чалавека

Да 10 сьнежня 2008 году ў кінатэатры «Перамога» (вул. Інтэрнацыянальная, 20) праходзіць паказ мастацкіх і дакументальных фільмаў «Чалавечая годнасць, роўнасць, справядлівасць», арганізаваны Прадстаўніцтвам ААН у Беларусі, Офісам АБСЭ ў Менску і Прадстаўніцтвам Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах уцекачоў.

У праграму паказу, прымеркаванага да 60–годдзя прыняцця Дэкларацыі правоў чалавека, увайшлі наступныя фільмы: 4 снежня: «Завадны апельсін»; 5 снежня: «Хто ніколі не жыў»; 8 снежня: «Бягун за ветрам»; 9 снежня: «У рукі незнаёмцаў»; 10 снежня: «Паўночны экспрэс». Пачатак сеансаў – у 19.00. Уваход вольны. Уваходныя квіткі можна атрымаць у касе кінатэатра «Перамога» ў дзень паказу з 18.00. Колькасць квіткоў абмежаваная колькасцю месцаў у кіназале.

## СПЕКТАКЛІ

### Купалаўскі тэатр

**5 (пт), 6 (сб)** — «Ядвіга»
**7 (ндз)** — «Маэстра»
**8 (пн)** — «Ідылія»
**10 (ср)** — «Ваўкі і авечкі»
**12 (пт)** — «Сямейнае шчасце»
**13 (сб)** — «Сны аб Беларусі»
**14 (ндз)** — «Макбет»
*ранішнія спектаклі*
**14 (ндз)** — «Афрыка»
*малая сцэна*
**10 (ср), 11 (чц)** — «Апельсінавае віно»
**12 (пт)** — «Маці»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

### Шэдэўр Стэнлі Кубрыка

На вялікім экране ў кінатэатры «Перамога» этапная стужка 1970–ых — «Завадны апельсін»

**Завадны апельсін** (Clockwork Orange)

Вялікабрытанія, 1971, каляровы, 137 хв.

**Рэжысёр:** Стэнлі Кубрык

**Ролі выконваюць:** Малькольм Макдаўэл, Патрык Мэгі, Майкл Бэйтс, Уорэн Кларк, Джон Клайв, Эдрыен Коры, Карл Дзюрынг

**Жанр:** Антыўтопія, крымінальна–філасофская драма паводле раману Энтані Бёрджэса

**Адзнака:** 10 (з 10)

Важак банды Алекс (Малькольм Макдаўэл) п'е малако, слухае Бэтховена, а ў прамежках між гэтымі мілымі заняткамі гвалтуе і забівае. Яго садзяць у турму. А там яму прапануюць вылекавацца ад агрэсіі. Тады пасля выхаду з вязніцы ціхмяны Алекс сам стаецца ахвярай жорсткага грамадства…

Правакацыйны шэдэўр Стэнлі Кубрыка застаецца свежым і неперадузыйдзеным.

**Андрэй Расінскі**



ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Нігерыйскія лісты

**Лёлік Ушкін.** Фельетон.

Вось дык удача — узялі ў Расіі мільярд пад усякія адзіныя валюты і незалежныя Абхазіі, а на выхадзе нічога не зрабілі. Баюся аднаго: каб нашымі эфектыўнымі метадамі не зацікавіліся міжнародныя круцялі. Напрыклад, аўтары гэтак званых нігерыйскіх лістоў.

— Катастрофа! — у кабінет начальніка ў прэзідэнцкай адміністрацы ўварваўся яго намеснік. — Паштовыя скрыні расійскіх палітыкаў атакуюць спамам — нігерыйскімі лістамі.

— Што? — не зразумеў гаспадар кабінету. Якія лісты? Якія негры?

— Нігерыйскія лісты — гэта форма круцельства. Іх аўтары прапануюць адрасату нейкія паслугі, калі той папярэдне пералічыць грошы на іх рахунак. Натуральна, кідалава.

— І што? Яны жадаюць прадаць Зюганаву віягру, а Жырыноўскаму — сродак, які павялічвае рэйтынг на 20 см?

— Горш! Пачытайце самі, — намеснік дастаў некалькі аркушаў.

Той прабегся вачыма па тэксце: «Шаноўны містэр расійскі палітык, піша Вам Абубакар Гавон, правадыр народу Юмба-Мумба. У суботу шаман заявіў, што бог Малімба загадаў нам прызнаць Абхазію і Паўднёвую Асецію. Праўда, на шляху дыпламатычнага прызнання ўзніклі тэхнічныя пытанні, звязаныя з адкрыццём нашага консульства ў Цхінвалі. Трэба дробязь — два мільярды даляраў. У знак доказу нашай чэснасці гатовыя на першым этапе ўзяць мільярд. Другі — калі выканаем увесь пакет абяцанага. З найлепшымі пажаданнямі, мая вялікасць Абубакар Гавон».

Наступны тэкст быў не лепшы: «Шаноўны містэр расійскі палітык. Піша Вам Ібрагім Бабангіданаву, прэзідэнт Аб'яднаных астравоў Слановай Косці. Мой урад гатовы заключыць з РФ дамову пра сумесную сістэму паветранай абароны і перайсці на адзіную валюту (расійскі рубель). Праўда, на шляху інтэграцыі ўзніклі тэхнічныя пытанні, звязаныя з пераходам з нашай традыцыйнай валюты — скурак лемураў, на расійскія грошы. Трэба дробязь — два мільярды даляраў. У знак доказу нашай чэснасці гатовыя на першым этапе ўзяць мільярд. Другі — калі выканаем увесь пакет. З найлепшымі пажаданнямі».

Да апаратчыка дайшло. «Праз гэтых Абукабараў мы можам не атрымаць нічога ад Расіі. Ёсць ужо іх рэакцыя на іх лісты?»

Намеснік паглядзеў у паперкі: «Паводле дадзеных нашага пасольства, пазаўчора Барадзін сказаў, што «расійска-юмба-мумбаўскае сяброўства — прыклад інтэграцыі для постсавецкай прасторы, а з часам да яго падключацца ўсе краіны Еўрасаюзу».

Значыць так, — кіраўнік узяў сябе ў рукі. — Цяпер тваё прозвішча не Кавякоў, а Гавон, ты прынц Мумба-Юмбы. Пішы расіянам, што гатовы інтэгравацца з імі за паўтара мільярда.

Пакуль аддаваліся распараджэнні, на паштовую скрыню начальніка прыйшоў ліст з наступным зместам: «Шаноўны містэр беларускі палітык. Піша Вам, Іван Іваноў, адзін з супрацоўнікаў адміністрацыі «Газпрому». Я вялікі аматар гісторыі нашых народаў і магу паспрыяць таму, што цана на газ для Вашай краіны ў наступным годзе будзе 5 даляраў за тысячу кубаметраў. Праўда, на шляху інтэграцыі ўзніклі тэхнічныя пытанні, звязаныя з тым, што трэба ўлагодзіць справу з Грэфам і Чубайсам. Патрэбна дробязь — два мільярды даляраў. У знак доказу нашай чэснасці, гатовыя на першым этапе ўзяць мільярд. Другі — калі выканаем увесь пакет абяцанага. З найлепшымі пажаданнямі, славянафіл Іван Іваноў».

ВОСЬ СІМВАЛ ТВОЙ...



ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ



## «Рыфмы» Руслана Вашкевіча

**6 снежня ў галерэі «Падземка»** мастак Руслан Вашкевіч прэзентуе свой новы праект «Рыфмы». «Усе мы чыесьці рыфмы, а ўсё астатняе — гэта знешні адпаведнік нашым унутраным уяўленням, супадзенне інтанацый, рытм цёплахалодных рухаў,» — лічыць Руслан Вашкевіч.

У новым праекце карціна ўступае ў цікавы дыялог са сваёй фотаверсіяй, у фатаграфію пранікае вірус мастацкасці.

АНЕКДОТ

Чалавек пытаецца ў банкаўскага спецыяліста:

— Я хачу пачаць малы бізнес. Што мне трэба рабіць?

— Купіць вялікі бізнес і чакаць.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Казань.** Тутэйшаму губернатару не спадабаўся «Волжскі лісток». Паклікаў ён тады гаспадара друкарні, дзе друкавалася газета, і нешта яму сказаў. Вярнуўшыся, гаспадар зараз жа не дазволіў далей друкаваць у сябе «ВЛ». Даведаўшыся аб гэтым, і другія друкарні не згадзіліся друкаваць. Дзеля таго газета мусіла закрыцца, бо не мела ўласнай друкарні.

**«Наша Ніва». №24 ад 3 лістапада 2008**

Выказваем спачуваньні Лёлі Касоўскай з Трэнтану (Нью-Джэрзі, ЗША) з прычыны сьмерці мужа Лявона. Сябры і калегі

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5126. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 03.12.2008.
Замова № 6732.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.
ISSN 1819-1614
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
9771819161008 08045